ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожай. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -ваднку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар . . . 10-74
Сакратар . . . 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

Пятніца 11 красавіка 1930 г. № 84 (3592) Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

За дзелавую, паглыбленую самаправерку

Гадавіна сацыялістычнага спаборніцтва (1-га мая) павінна прайсьці пад знакам дзелавога агляду выпікаў спаборніцтва, пад знакам найшырэйшай самаправеркі ходу сацспаборніцтва.

Бяз шуму, без параднасьці, прыгожых фраз, юбілейных кампліментаў. Параднасьць, створаную ў некаторых мясцох наўкола вялізарнага руху мас, цяпер, у гадавіну сацспаборніцтва, трэба зьнішчыць канчаткова.

Праверка бяспрэчна выявіць пямала выпадкаў нядбайнасьці, дрэннай работы, адсутнасьці сапраўднага бальшавіцкага сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба будзе рашуча выкрыць ілжэ-ударніцтва, спаборніцтва на паперы. Трэба будзе вакол усяго ілжывага, параднага стварыць такую грамадзкую думку, каб папярэдзіць на будучае паўтарэньне падобнага.

Адначасова праверка павінна выкрыць няўмелых і нягодных кіраўнікоў, якія ня могуць стаць на чале энтузіязму рабочых мас, яна павінна выкрыць бюракратаў, якія тармозяць разьвіцьцё ініцыятывы перадавых рабочых. У выніку самаправеркі трэба выкрыць недахопы ў рабоце прафарганізацый па кіраўніцтве ўдарнікамі і па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Самаправерка павінна выкрыць тых прафработнікаў, якія многа крычаць аб перабудове прафсаюзнай работы, а па справе праводзяць апартуністычную практыку трэд'юніянізму, якія плятуцца ў хвасьце адсталых пластоў рабочых, не арганізуюць масы на барацьбу за выкананьне прамфінпляну.

А што ў нашых прафсаюзных органах яшчэ шмат апартуністычнай гнілі, даводзіць рад фактаў работы нашых прадпрыемстваў за першае паўгодзьдзе, рад прарываў у выкананьні прамфінпляну.

Роспускам фабзаўкомаў на некаторых прадпрыемствах (завод «Пралетары», фабрыкі «Дняпроўская мануфактура», «Праца» і інш.) зроблена толькі частка работы. Распусьціць фабзаўком—самая лёгкая справа. Больш цяжка **навучыць** фабзаўком стаць сапраўдным кіраўніком мас на вытворчасьці. І якраз у гэтай галіне, у справе кіраўніцтва фабзаўкомамі некаторыя вышэйшыя зьвеньні прафсаюзаў праяўляюць недапушчальную бязьдзейнасьць.

Кіраўніцтва нізавымі праф'ячэйкамі ў значнай частцы ўсё яшчэ застаецца **папяровым.** Замест жывога кіраўніцтва, замест практычнай дапамогі—некаторыя прафорганы абмяжоўваюцца рассылкай нізавым праф'ячэйкам копій прафсаюзных дырэктыў.

Нават у падрыхтоўцы да гадавіны сацспаборніцтва, у арганізацыі самаправеркі выкананьня прамфінпляну, сацдагавораў і ўдарніцтва, некаторыя прафорганы праяўляюць пячуваны бюракратызм, а ў радзе выпадкаў плятуцца ў хвасьце мас (матар'ял, які сёньня друкуецца ў «Зьвяздьдзе», выразна аб гэтым сьведчыць).

Пастаянным лёзунгам у рабоце прафарганізацый павінны быць—**якасьць сацспаборніцтва, якасьць і плянавасьць кіраўніцтва ўдарнікамі.**

На прадпрыемстве, на якім разгорнута сацспаборніцтва, кіраўніцтва гаспадарнікаў і прафсаюзаў павінна быць пастаўлена па-ўдарнаму.

З боку **гаспадарчага кіраўніцтва** патрабуецца, каб вытворчая праграма была даведзена да цэху, брыгады, камуны і агрэгату, каб быў наладжаны ўлік выкананьня праграмы і сацспаборніцтва. Калі ў выніку самаправеркі будзе зроблены крок наперад у справе паляпшэньня плянаваньня вытворчых працэсаў, то гэта будзе перамогай ня толькі на гаспадарчым фронце, але гэта будзе перамогай і сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба перамагчы раўнадушныя адносіны гаспадарнікаў да пытаньня аб вытворчых заданьнях. Матар'ялы, якія ня раз друкаваліся ў «Зьвяздзе» (гл. хаця-б «Зьвязду» № 79), сьведчаць, што ніякіх аб'ектыўных цяжкасьцяй у давядзеньні вытворчых заданьняў да цэху, да брыгады і асобнага рабочага няма. Есьць толькі коснасьць, бюракратызм, ці слабая работа гаспадарчых органаў.

Ад **прафсаюзных арганізацый** патрабуецца кіраўніцтва і дапамога ўдзельнікам сацспаборніцтва. Прафсаюзныя работнікі павінны быць у курсе гаспадарчых спраў прадпрыемства, каб своячасова мабілізаваць масу на барацьбу з прарывамі, каб накіраваць энтузіязм мас на правільным рэчышчы. Прафсаюзы павінны ўмець заўважаць усе станоўчыя і адмоўныя зьявішчы ў рабочай масе. Ва ўдарным парадку праводзіць у жыцьцё новыя формы работы, арганізацыйна замацоўваць дасягненьні ўдарнікаў і дапамагаць ім дабівацца лепшых паказальнікаў у рабоце.

Самаправерка павінна выклікаць новую хвалю энтузіязму мас, накіраваць гэтую хвалю ў рэчышча сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарнага руху.

Гадавіна сацспаборніцтва павінны паслужыць новым моцным штуршком да выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, да барацьбы за хутчэйшыя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Каб усе гэтыя задачы былі з посьпехам выкананы, трэба неадкладна разгарнуць шырокую масавую работу вакол праверкі і падрыхтоўкі да гадавіны сацспаборніцтва. Чарапашыны тэмпы падрыхтоўкі павінны быць рашуча адкінуты. Да 1-га мая засталося **менш 20 дзён.** Кожнаму цэнтральнаму праўленьню саюзу, кожнаму фабзаўкому трэба скласьці такі плян падрыхтоўкі, **каб ні адзін дзень ня быў страчаны дарма.** У працяўным выпадку падрыхтоўка да гадавіны сацспаборніцтва і сьвяткаваньня гэтай гадавіны на тым ці іншым прадпрыемстве, будзе скомкана.

Дырэктыва аб шэфстве заводаў над савецкім апаратам ня выконваецца

Ужо прайшоў амаль месяц, як ЦК і ЦКК УсеКП(б) прынялі пастанову аб арганізацыі шэфства рабочых фабрык і заводаў над дзяржапаратам. Гэты тэрмін дае поўнае права паставіць пытаньне, што канкрэтна ўжо зроблена для ажыцьцяўленьня важнейшай дырэктывы партыі ў справе арганізацыі сыстэматычнага кантролю рабочых мас над дзяржапаратам. На жаль, мы павінны адзначыць, што масавая работа на выкананьні вышэйказанай дырэктывы на прадпрыемствах не разгорнута.

Усё яшчэ ў габінэтах распрацоўваецца пытаньне аб тым, якія фабрыкі і заводы прымацаваць да тае або іншае савецкае ўстановы, да гэтага часу яшчэ невядома хто будзе шэфстваваць над цэнтральнымі і хто над акруговымі савецкімі ўстановамі.

Гута «Пралетары» (Менск) шэфства над НКЮ зьявіла толькі да сумеснага шэфства над вёскай.

Фабрыка «Чырвоная Бярэзіна» прынята шэфства над апаратам Барысаўскага ЦРК, але-ж практычна нічога не зрабіла.

Аргінструктарскі сэктар ЦСПСБ ня ведае, што робіцца на мясцох, у гэтай галіне, і, між іншым, лічыць, што калі шэфства, на падставе пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б), праводзіцца пад кіраўніцтвам органаў КК-РСІ, значыць яны і павінны займацца арганізацыяй гэтае справы. Сэктар забыў, што ў гэтай-жа пастанове ЦК і ЦКК УсеКП(б) гаворыцца: «ЦК і ЦКК лічыць, што прафсаюзы ў большай меры, чым да гэтага часу павінны прыняць актыўны ўдзел у справе арганізацыі масавага кантролю знізу над савецкім апаратам». Шэфства і выключэньне рабочых і работніц павінна стаць адной з важнейшых форм удзелу прафсаюзаў у барацьбе з бюракратызмам у савецкім апараце».

Мясцовыя органы КК-РСІ таксама яшчэ не разварушыліся ў гэтай справе.

Чым-жа інакш тлумачыць тое, што ў Менскай АКК-РСІ нашаму супрацоўніку адказалі, што «нічога пра праробленую работу сказаць ня можам, бо адсутнічае супрацоўнік, які займаецца гэтай справай». Значыць, пакуль што гэтай важнай справай займаюцца толькі асобныя працаўнікі. У акругах справа стаіць яшчэ горш. Нават акруговыя газэты («Віцебскі Пралетары», «Полесская Правда», «Камуніст») не зьмясьцілі ні аднаго радка пра арганізацыю шэфства заводаў над дзяржапаратам.

Усё гэта прымушае нас з усёй катэгарычнасьцю паставіць пытаньне аб неабходнасьці ў найхутчэйшым тэрміне дабіцца рашучага пералому ў гэтай справе, з усёй сілай ударыць па недаацэнцы шэфства заводаў над дзяржапаратам.

Трэба зараз-жа арганізаваць шырокую прапрацоўку пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб шэфстве заводаў над дзяржапаратам. Не павінна застацца ні аднаго заводу, які-б ня меў сталае сувязі з савецкім апаратам, які-б ня вёў бязьлітаснай барацьбы з бюракратызмам у рабоце савецкага апарату.

Праз шэфства заводаў над дзяржапаратам трэба наладзіць сыстэматычную работу на вылучэньні лепшых актывістых, брыгадзіраў, ударнікаў на пастаянную работу ў савецкім апараце, дапамагаць ужо працуючым вылучэнцам хутчэй авалодваць у курс даручанай работы, наладзіць сыстэматычную справаздачнасьць кіраўнікоў савецкага апарату перад шырокімі масамі рбочых.

Ш.

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА

МАБІЛІЗУЮЧЫ УСЕ СІЛЫ І СРОДКІ,

на хаду выпраўляць недахопы

ў падрыхтоўцы і правядзеньні палявых раб

КАНЦЭНТРУЮЧЫ ЎВАГУ НА ПРАВІЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ СЯЎБЫ Ў КАЛГАСАХ, НЕ ЗАБЫВАЦЬ ПРА ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ ГАСПАДАРКІ

ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ ГАСПАДАРКАМ НЕ АДДАЕЦЦА НІЯКАЙ УВАГІ

У Вульскім раёне, Полацкай акругі, індывідуальны сэктар складае яшчэ 80 проц. Раённыя арганізацыі, аднак, яшчэ не зрабілі з гэтага патрэбных вывадаў. Плян пашырэньня пасеўнай плошчы не даведзены, нават, да вёскі. У радзе сельсаветаў пытаньне аб веснавой сяўбе і аб практычных мерапрыемствах наогул не абгаворвалася. Не растлумачаны тыя ільготы, якія дае новы закон аб с.-г. падатку індывідуальным бядняцка - серадняцкім гаспадаркам для пашырэньня яравога кліну і правядзеньня агра і зоамінімуму.

Кулацтва разгарнула агітацыю за зрыў вясновай сяўбы з індывідуальнымі бядняцка - серадняцкімі гаспадаркамі і не сустракае належнага адпору з боку мясцовых работнікаў. Частка сераднякоў у выніку адсутнасьці належнай растлумачальнай работы падпала пад уплыў кулакоў. У некаторых сельсаветах наглядаюцца выпадкі падачы заяў паасобнымі сераднякамі аб адмаўленьні ад часткі зямлі. Ва Ўсьвейскім сельсавеце падана такіх 8 заяў.

Ніхто ня цікавіцца арганізацыяй дапамогі індывідуальным бядняцкім гаспадаркам.

Зусім лішне гаварыць, што становішча, якое стварылася ў раёне, галоўным чынам, тлумачыцца тым, што належнай работы з беднатой, яшчэ ня ўступіўшай у калгасы, не вядзецца.

Брыгадзіры «Зьвязды»
МІНОВІЧ, ХАЛЯВІН.

⁂

У Дрысенскім раёне (Полаччына) калгасамі ахоплена 30 проц. плошчы раёну. Ня гледзячы на тое, што 70 проц. плошчы, такім чынам, знаходзіцца ў індывідуальным карыстаньні бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, раённыя арганізацыі амаль не зварачваюць ніякай увагі на падрыхтоўку да сяўбы ў індывідуальным сэктары.

Пастанова ўраду аб ільготах па новым законе аб с.-г. падатку, апошні артыкул т. Сталіна і пастанова ЦК УсеКП(б) аб новых ільготах калгасам зусім не папулярызаваны сярод сялянскага насельніцтва.

Полацкія акруговыя арганізацыі павінны зараз-жа ўжыць усе меры, каб забясьпечыць працоўнай дапамогай, крэдытамі і насеньнем бяднякаі-серадняцкія гаспадаркі, якія адчуваюць у гэтым патрэбу.

АНУЧЫН.

Працоўныя Дрысы сустракаюць трактарную калёну



Гэтымі днямі мястэчка Дрыса, якое знаходзіцца недалёка ад мяжы з 2 суседнімі дзяржавамі — Польшчай і Латвіяй, а таксама і вакольныя вёскі былі зьдзіўлены нязвычайным шумам. Быццам эскадрыльля самалётаў недзе гула.

Гэта са станцыі ішла ў мястэчка трактарная калёна ў складзе 10 «Фардзонаў». Звыш 2 тысяч чалавек выйшлі сустракаць сталёвых коняй. Масавы мітынг пад гул трактараў яшчэ раз давёў аб вытворчай змычцы паміж рабочымі і сялянствам, якая з кожным днём усё больш узмацняецца.

На здымку — трактарная калёна ідзе па вуліцах мястэчка.

КАМУНА ІМЯ „ЗЬВЯЗДЫ“---УЗОР ДЛЯ УСЕЙ КАСЬЦЮКОЎШЧЫНЫ

8-га красавіка камуна, добра падрыхтаваўшыся, арганізавана пачала сяўбу

Камунары запэўнілі партыю: яравы клін у 623 гэктары цалкам будзе засеены

Камуна імя газэты «Зьвязда», пад якой прынялі шэфства рабочыя і служачыя друкарні і рэдакцыі газ. «Зьвязда», зьяўляецца самай буйнаю і моцнаю ў Касьцюковіцкім раёне. Яна аб'ядная 108 гаспадарак вёскі Вятухна на плошчы 1.516 гэкт. ворнае зямлі.

Зараз камуна зьяўляецца ўзорам для ўсіх калгасаў раёну. Камуна **своячасова і добра** падрыхтавалася да веснавой сяўбы. Увесь сельска-гаспадарчы інвэнтар **адрамантаваны,** закуплена 50 новых плугоў. **Скончана** очыстка ўсяго **насеньня.**

Савет камуны разам з актывам камунараў вызначыў яравы клін (агранома райкалгасаюз сюды ня прыслаў), разьбіў яго на палеткі, дзе і якія культуры сеяць. У камуне ўстаноўлена зьдзельная аплата працы, паводле 5-піразраднай тарыфнай сеткі. Вядзецца сталы вучоў усе праробленае працы. Камунары надзелены на 7 брыгад — 5 брыгад па засеве яравога кліну, брыгада цесьляроў і брыгада жывёлаводаў. Да кожнага камунара прымацаваны конь, калёсы, плуг, збруя. За ўсё гэта кожны камунар нясе адказнасьць. Увесь інвэнтар і прылады знаходзяцца ў вельмі добрым стане.

7-га красавіка, у дзень рэлігійнага сьвята «Благавешчаньня», **брыгада добраахвотнікаў - сейбітаў вышла ў поле для засеву канюшыны па жыце.** У той-жа дзень, увечары, на сходзе ўпоўнаважаных камуны было пастаноўлена арганізаваць калёны добраахвотнікаў, якія будуць працаваць на вялікдзень. Заробленыя ў гэтыя дні грошы камунары пастанавілі перадаць **у фонд пабудовы зскадрыльлі «Наш адказ папе Пію Хі».** Тут-жа на сходзе **запісалася 30 добраахвотнікаў,** якія ў вялікдзень выйдуць у поле.

8-га красавіка камуна «Зьвязда» пачала сяўбу. Калёны камунараў арганізавана выехалі ў поле. Адчувалася добрая ўвязка ў рабоце і сувязь паміж калёнамі. На полі адбыўся лятучы мітынг, прысьвечаны пачатку веснавой сяўбы. На мітынгу камунары прасілі перадаць шырае прывітаньне рэдакцыі газ. «Зьвязда».

Камунары запэўнілі партыю, што яравы клін у 623 гэктары будзе засеены цалкам. Камунары выклікалі на сацспаборніцтва Бухарапралетарскую камуну.

Пад воклічы «ура» сялян вакольных вёсак **80 аратых дружна ўзяліся за работу.** Першую баразну пачаў старшыня камуны Фраленцкаў Прохар.

Камуна па характары сваёй гаспадаркі зараз набывае жывёлагадоўчы ўхіл. Сёлета камуна распачала рад будаўнічых работ. **Канчаецца пабудова хлява на 100 галоў рагатае жывёлы.** У хуткім часе пачынаецца пабудова другога хлява і сьвірна для збожжа. У камуне ўстаноўлены сэпаратар для пераапрацоўкі лішкаў малака.

Брыгадзір «Зьвязды» В. ВОІНАЎ.

200.000 руб. крэдытаў не скарыстань

РАГАЧОЎ. (Па тэлефону). Да арг зацыі «Зьвязды» генэральнай праве ў раёне нічога не ведалі аб тым, ідзе падрыхтоўка да сяўбы на мясц Агляд значна пасунуў працу па п рыхтоўцы напярэд, але яна яшчэ ня сім здавальняючая.

Зараз у Рагачоўскім раёне капект завана 20 проц. гаспадарак. Калг ачысьціліся ад выпадковых элемэн і ад усіх тых, хто перашкаджаў разг ваньню работы. Настрой калгасьні бадзёры. Калгасы да сяўбы падрыхта ны, як гэта паказалі пробныя выезды поле.

Дрэнна ідзе падрыхтоўка да сяўбы індывідуальным сэктары. Ні сельсавет ні РВК ня прымаюць належных м каб забясьпечыць пашырэньне па най плошчы для ажыцьцяўленьня а мерапрыемству у індывідуальным тары.

Раённыя ўстановы кепска абслугоў юць патрэбу госп. Характэрны п клад. Калгасьні з калгасу «Аэзтаў Мярнулавіцкага сельсавету, два дні калі па гораце, каб атрымаць 180 вапны, сустракаючы ўсюды бюра тычныя адказы: «вапны няма». тым, на станцыі стаяць неразгруж мі вагоны з вапнай.

Крэдыты на мерапрыемствы па навой с.-г. кампаніі не скарыстоў ца. З 400.000 руб. толькі 200 тысь рыстаны і то ў апошнія дні. Крэдыт таварыствы стаяць рад бюракратыч перашкод пры водпуску крэдыту к сам. Весь яшчэ адзін абураючы ф Камуна з Мярнулаўскага сельсавету ла на бягучым рахунку ў мясцо крэдытным таварыстве 5.000 руб. Т рыства закрылася. У сувязі з гэтым мунары доўгі час не маглі атрымац таварыства гэтыя грошы на пат вясновай кампаніі. Толькі зараз ім дана ўсяго 1.000 руб.

АРКУ

4 вёскі ўступілі ў калгасы

ЛЯДЫ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). АПУБЛІКАВАНЬНЕ АРТЫКУЛУ ТАВ. СТАЛІНА «АДКАЗЫ ТАВАРЫШОМ КАЛГАСЬНІКАМ» І ПАСТАНОВЫ ЦК І ЛЬГОТАХ КАЛГАСАМ ЗРАБІЛІ ВЯЛІКАЕ ЎРАЖАНЬНЕ НА СЯЛЯНС РАЁНУ.

ВЁСКІ РАСКАВА, КАБЫЛІЯ, БАГДАНАЎШЧЫНА І ЛЯДНЯНШЧ ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА НА ТЭРЫТОРЫІ АГРАКАМБІНАТУ І РАНЕЙ ВЫ ШЛІ З КАЛГАСАЎ, ЗАРАЗ ЦАЛКАМ ВЯРНУЛІСЯ ЗНОЎ У КАЛГАСЫ.

КАЛГАС ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА І ГАРОДНАЯ АРЦЕЛЬ У ЛЯ УЖО ВЫЙШЛІ Ў ПОЛЕ. ГЭТЫМІ ДЯЯМІ ПРЫБЫЛА ТРАКТАРНАЯ КА З 8 ТРАКТАРАЎ.

СЯРОД БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ - КАЛГАСЬНІКАЎ НАГЛЯД ЦА ВЯЛІКІ ПРАЦОЎНЫ ЎЗДЫМ.

АГРАКАМБІНАТ ВАЙЛІНГОЛЬД

Добра падрыхтаваліся

САМАХВАЛАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Калгасы імя 1-га мая і «Новы Крупіцкага сельсавету, добра падрыхтаваліся да сяўбы. Рабочыя пляны дзены да кожнага калгасьніка. Калгасьнікі разьбіты на паасобныя брыгад вэнтар увесь адрамантаваны, насеньне пратручана.

Калгас імя 1-га мая ўжо вышаў у поле. Калгас «Новы быт» выходз поле 12-га красавіка.

Беднякі і сераднякі, якія раней выйшлі з калгасаў і якім вызначана ля ў індывідуальным парадку, зараз адмаўляюцца ад яе і ўступаюць у гасы.

Старшыня кустаб'яднаньня ГАЙДУРЭВІЧ.

70 мільёнаў насельніцтва Індыі пастаянна галадае

40 кап.—за 14-гадзінны рабочы дзень у капальнях

40% бюджэту—на ваенныя ўзбраеньні

ЛЁНДАН, 1. У Калькуцкім органе легага крыла Ўсеіндыйскага нацыянальнага кангрэсу «Лібэрты» апублікаваны ліст члена палаты абчын — **Фрымона** аб становішчы ў Індыі.

Фрымен заяўляе, што **існуючыя ў Індыі эканамічныя ўмовы** нястрымана **«штурхаюць краіну да рэвалюцыі».** Асноўныя фактары, якія сур'ёзна і непасрэдна пагражаюць ангельскаму панаваньню ў Індыі, — піша Фрымен, — **гэта галеча мас і нездавальненьне рабочых і сялян.** З 240 мільёнаў жыхароў, якія знаходзяцца пад непасрэднай уладай Англіі ў Індыі — **70 мільёнаў пастаянна галадае. У Індыі на 70 тысяч жыхараў налічваецца адна больніца. У Бамбэі 9 проц. дзяцей рабочых памірае ва ўзросьце аднаго году.** У сярэднім жыве індус менш **25 год. Школамі ахоплена толькі 4 проц. насельніцтва.** Пры тым толькі 10 проц. мізэрных затрат на асьвету пакрываецца дзяржаваю. **Становішча** рабочых, у прыватнасьці, тых сотень **рабочых, работніц і дзяцей, якія заняты на плянтацыях, горшае за становішча нявольнікаў.** Гарнякі ў каменавугальных капальнях працуюць **11 і нават 14 гадзін у дзень, атрымліваючы заработную плату ў разьмеры 40 капеек.**

Нязносна падатковы цяжар у Індыі. Асабліва цяжкія падаткі, якія падаюць **на долю бяднейшага насельніцтва.** Дзяржаўныя прыбыткі ў Індыі, уключаючы прыбыткі цэнтральных і правінцыяльных урадаў, складаюць 150 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. З іх больш 70 мільёнаў, **г. зн. каля 40 проц. ідзе на ваенныя мэты,** а 10 проц. — на ўтрыманьне адміністрацыйнага апарату. У той-жа час **на сельскую гаспадарку,** у якой занята, прыкладна, 90 проц. усяго насельніцтва Індыі, **выдаткуецца менш, чым 1 проц.** без дзяржаўных прыбыткаў, на прамысловасьць 5 проц., **а на ахову здароўя каля 3 проц.**

Фрымен прыходзіць да заключэньня, што пры такіх умовах зусім зразумела, што ў Індыі ўвесь час расьце лік людзей, якія не жадаюць гаварыць з англічанамі. Фрымен баіцца, што **«Індыя ня будзе больш чакаць».**

ЗАКАНЧЭНЬНЕ МІРУЦКАГА ПРАЦЭСУ

ЛЁНДАН, 3. Працэс 32 міруцкіх вязьняў скончыўся 4 сакавіка.

БАРАЦЬБА ІНДЫЙСКІХ ЧЫГУНАЧНІКОЎ

ЛЁНДАН, 9. Як паведамляюць з Бамбэю, паліцыя напала на 30 бастуючых, якія ляглі на рэйкі ля станцыі Барыбуты, каб спыніць рух цягніку. **Паліцэйскія цяжка паранілі некалькі бастуючых. 10 бастуючых арыштаваны. Адзін з бастуючых зарэзаны цягнікам, які ня спыніўся, ня гледзячы на тое, што бастуючы ляжаў папярок рэйк.** У Бамбэі добраахвотнікі з атрадаў грамадзянскага непаслушэньства зрывалі в прахожых на вуліцы капялюшы заграничнага паходжаньня і потым урачыста палілі іх на кастры.

ЛЁНДАН, 9. Па зодле вестак з Бамбэю, бастуючым рабочым вялікай Індыйскай паўвостраўнай чыгункі ўдалося затрымаць на 2 гадзіны паштовы цягнік Калькута—Бамбэй, каля станцыі Нагпур. Група бастуючых чыгуначнікаў лягла на рэйкі і гетым перашкодзіла руху цягніку. Да месца вымушанай астаноўкі пятнаццаць была выкліканы па тэлефоне ўзброеная паліцыя. Адбылася сутычка. **Паліцыя арыштавала 25 бастуючых.** Бастуючыя мяркуюць вясьці і далей актыўнае супрацьлеглае на суседнім вучастку. (ТАСС).

Падрыхтоўка чарговай антысавецкай кампаніі у Францыі

Рэакцыянэры дамагаюцца разрыву з СССР

ПАРЫЖ, 8. З прычыны няўдачы з купеаўшчынай лютаўскае паўстаньне ў Індакітаі рэакцыйныя колы Францыі стараюцца выкарыстаць у мэтах падрыхтоўкі чарговай антысавецкай кампаніі. З гэтага погляду заслугоўвае ўвагі выступленьне раду правых газэт, у прыватнасьці «Журналь дэ Дэбэ» з заявамі, што **пытаньне аб разрыве дыплёматычных зносін паміж Францыяй і СССР усё-ж ня можа быць зьнята з парадку дня,** з прычыны «падрыўной работы савецкіх агэнтаў у францускіх калёніях».

Аб падрыхтоўцы антысавецкае кампаніі ў сувязі з індакітайскімі падзеямі сьведчыць таксама рэзалюцыя, прынятая пленумам францускага калёніяльнага інстытуту па дакладу Готэро «аб бальшавізацыі францускіх калёній». Готэро ў сваім дакладзе заяўляў, што «чырвоны імпэрыялізм мае тым больш пагражаючы характар, што ня сустракае належнага адпору з боку нашай дзяржаўнай палітыкі». Готэро, а таксама выступіўшы ў спрэчках вядомы рэакцыйны дэпутат ад Індакітаю **мільянэр Утрэ** заклікалі змагацца супроць недацэнкі «бальшавіцкай пагрозы ў францускіх калёніях». Паводле іх слоў гэта пагроза ў сучасны момант больш актуальна, чым калі небудзь.

Ва ўхваленай пленумам рэзалюцыі гаворыцца, што Камінтэрн, а таксама поўнасьцю салідарны з ім савецкі ўрад, ставіць сабе мэтаю вырваць у Францыі яе калёніі, арганізуючы для гэтага паўстаньні, разлагаючы калёніяльныя войскі, падрываючы забастоўкамі работу морскага транспарту і г. д. Напамінаючы аб нядаўнай заяве міністра калёній, што падзеі ў Інда-Кітаі маюць крыніцаю «замежныя бальшавіцкія ўплывы», пленум зварачаецца з заклікам да францускага ўраду «прыняць рашучыя меры супроць гэтай прапаганды і нарваць дыплёматычныя зносіны з Савецкім урадам». (ТАСС).

Ваяўнічыя пляны Польшчы

Узброены паход супроць СССР

ВАРШАВА, 9. «Газэта Варшаўска» зьмяшчае сёньня другі артыкул **Р. Дмоўскага.** У гэтым артыкуле лідэр нацыянал-дэмакратаў падыходзіць пічыльна **да праектаў ваеннага паходу супроць СССР і ролі, якая прызначана Польшчы адыграць у гэтай вайне.**

Прадстаўніком прамысловасьці гандлю і фінансаў, якія падарожнічаюць па Заходняй Эўропе, — піша Дмоўскі — даводзіцца ўсё часьцей чуць ваенныя лёзунгі і патрабаваньні ўзброенага паходу супроць СССР. **У сакрэтным парадку перадаецца, што такі паход ужо недзе, на некай нарадзе фінансістых вырашан.** «Цікава, — заўляе далей Дмоўскі, — што праз усе гэтыя праекты чырвонай істужкаю праходзіць ідэя ня гэтулькі візьвяржэньня савецкай улады, колькі падняволеньня **Расіі.**

Аказваецца, ваяўнічыя фінансістыя думаюць зусім рэальна. Яны нават і ня зьбіраюцца ўцягнуць у вайну свае жавы, маючы намер даручыць ц выкананьне гэтай ідэі Польшчы. ваецца, мы, палякі — заапчае Дм — карыстаемся ўсё яшчэ рэцэпт дурняў, якіх можна ўтаварыць и кую справу. **Польшчы абяцаюць п дзеле Расіі Усходнія землі.** Даюц зумець Польшчы, што на вызьдзеньн ны Польшча атрымае пазыку, вя рэч, за добрыя процанты. Сумна людзі могуць яшчэ разглядаць п зусім бямоглую жывёлу, але фа стаецца фактам».

Нарэшце Дмоўскі кажа: «Міжі ны камбінатор стаў на гэтулькі нічым, што татой весьці вайну з да апошняй кроплі польскай кры та не павінна ствараць ніякіх ілюз род тых, хто адважыўся павесьці ды, куды Польшча ісьці яя (ТАСС)

Польская дэфэнзыва таксама „рыхтуецца“ да 1 мая Масавыя аблавы і арышты ў Варшаве

ВАРШАВА, 9. З набліжэньнем 1-га мая польская палітычная паліцыя разгортвае шырокую дзейнасьць з мэтаю папярэдзіць першамайскія выступленьні. Сёньня газэты паведамляюць **аб масавых арыштах і аблавах у Варшаве.** Усяго было зроблена **80 вобыскаў,** у выніку якіх **арыштавана 54 чалавекі,** па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да кампартыі і камсамолу. (ТАСС).

Забастоўчны рух у К Кітаі ўзмацняецца

ПАРЫЖ, 9. Як падаюць Індаскія газэты, забастоўчны рух у Кітаі, ня гледзячы на жорсткі які панує дасьля прыдушэньня скага паўстаньня, ня толькі не с йўся, але яшчэ больш узмацніўся. да-Кітайскай прэсе паведамляецц падрабязнасьцяй аб забастоўцы на прыемствах **франка-азіяцкай камп Нхабе.** Апрача таго, паведамляецц **на рысавых плянтацыях у Дачь забаставалі** нулі, якія працавалі ным сэнсе слова ў **навольніцкіх у кінулі работу, перабілі наглядчы схаваліся** ў лясох. (ТАСС).

АГОНІЯ МАРСКОЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

ЛЁНДАН, 9. Агонія марской канфэрэнцыі, якая зацягнулася, відавочна, хутка скончыцца. Брыян, які вярнуўся ў Лёндан, меў спатканьне з Макдональдам. У выніку гэтага спатканьня, **выключана магчымасьць згоды паміж Англіяй і Францыяй.** Адзіным дакумантам канфэрэнцыі, падпісаным усімі 5 дзяржавамі, зьявіцца дэкларацыя аб «маралізацыі падводнай вайны», якая складзена ў гуманных выразах і заяўляецца **крокам назад нават у параўнаньні з Вашынгтонскаю згодаю.** Нечаканым вынікам усіх гутарак аб зьніщэньні падводнага флёту зьяўляецца **станоўчае выразьненьне пытаньня аб павялічэньні танажу падводных лодак ад 1.800 да 3.000 тон.** Апрача таго, в прычыны заявы Францыі, што яна ўжо мае будуе супэрсубмарыны з тан 3.000 тон. усім удзельнікам кан цыі дазволена таксама мець кольасьць супэрсубмарын у 3 т тон.

ФРАНЦЫЯ НЯ МОЖА ДАПУС РОЎНАСЬЦІ ФЛЁТУ З ІТАЛ

ПАРЫЖ, 9. Паводле паведам агэнцтва Гавас, французкі мар пістар Дэфэнсіль, у гутарцы а скім марскім міністрам Алекса заявіў, што французкая дэлегац **можа дапусьціць роўнасьці флёт** ніі і Францыі. Французкі флёт, і ці Францыі, павінен перар **італьянскі на 250 тысяч тон.**

ВЫНІКІ САКАВІКОВАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б

Даклад тав. ВАСІЛЕВІЧА на Менскім партактыве 1 красавіка

I. Пытаньні прамфінпляну

Апошні пленум Цэнтральнага Камітэта нашай партыі разгледзеў два пытаньні: аб выніках выкананьня прамфінпляну прамысловасьці БССР і аб становішчы калектывізацыі сельскай гаспадаркі, далейшых задачах у гэтай галіне.

Мінулы гаспадарчы год на шляху паляпшэньня ўсяго ўлічэньня дасягнуў вялікага ўзьнаўленьня прамысловасьці супроць мінулага года на 69 проц., рост рабочых — на 33 проц., рост прадукцыйнасьці працы — на 33 проц. Гэтыя пропанты гаворыць вялізарнейшых тэмпах будаўніцтва прамысловасьці ў Беларусі, аб тэмпах, якія даюць магчымасьць сапраўдна ўзарваць з адсталай, аграрнай Беларусі краіну аграрна-прамысловую.

Аднак, першы квартал дэ ў нам на ўсіх паказальніках недавальняючы вынікі. Зьніжэньне сабекошту мы мелі замест 11 проц. толькі на 6 проц., ня выканалі пляну ў першым квартале па агульнай вадавай прадукцыі прамысловасьці на 7,4 проц. Другі квартал, хаця і дае некаторыя ў гэтых адносінах, але гэты пераход зьяўляецца значна зусім недастатковым. Такім чынам ёсьць пагроза, мы да канца году, калі і надалей будзем выконваць планы прамысловасьці, будзем мець недавыкананы плян, і адмоўнымі вынікамі, якія ляцяць ёсьць для ўсяе народнае гаспадаркі БССР.

Асноўная прычына гэтых дрэнных паказнікаў заключаецца ў тым, што ў ўсіх нашых арганізацыях, якія нашы былі кіраваць і арганізоўваць прамысловасьць, ня была здавальняючая Партыйная, прафэсіянальныя і ўладарчыя арганізацыі зьяўляюцца ў большасьці месц сіноўнікамі недавыкананьня пляну ў першым квартале. Такі становішча з недавыкананьнем пляну прамысловасьці ў Цэнтральнага Камітэту.

Адназразовыя дырэктывы аб рацыяналізацыі вытворчасьці, аб арганізацыі шырокіх мас у выкананьні прамфінпляну праз вытворчыя нарады, ударныя брыгады, праз сацыянбарніцтва, на месцы на вялізарную актыўнасьць мас клясы, на вялізарнейшы энтузіязм рабочае клясы — нашымі арганізацыямі недавальняюча. (арганізацыі) на месцах ў радзе арганізаваць гэтую актыўнасьць, скарыстаць гэты энтузіязм так, каб мець максымальныя вынікі. Не правядзіцца ў жыцьцё рад важнейшых партыйных дырэктыў, накіраваных да лепшай арганізацыі работы прамысловасьці. Напрыклад, дырэктыва партыі аб адзінаначальні ня выканана да сёньняшняга дня. Мае месца боязьнь дырэктараў узяць на сябе адказнасьць, мае месца боязьнь ячэйкі «выпусьціць са сваіх рук» кіраўніцтва, ёсьць непаладкі ўнутры трохкутніку ў сувязі з правядзеньнем у жыцьцё прынцыпу адзінаначальня.

Пленум Цэнтральнага Камітэту вызначыў цэлы рад мерапрыемстваў для таго, каб пакрыць недавыкананьне ў першым квартале, каб абавязкова плян разьвіцьця прамысловасьці на ўсіх паказальніках быў-бы выкананы. Для гэтага ёсьць усе асноўныя падставы. Вялізарнейшая актыўнасьць рабочае клясы, вялізарнейшы энтузіязм, які ідзе праз ударныя брыгады і сацыянбарніцтва, павінны быць, як належыць, падхоплены і арганізаваны ўсімі нашымі арганізацыямі. Рашучае правядзеньне вызначаных пленумам мерапрыемстваў дасьць у ближэйшым-жа квартале належныя вынікі. Гаспадарнікі, прафсаюзнікі, рабочыя камуністы на вытворчасьці павінны выканаць і перавыканаць прамфінпляну, які мае такое вялізарнае значэньне для нашай сацыялістычнай прамысловасьці і для ўсяе нашае гаспадаркі цалкам.

Далей, таварышы, на гэтым скончыць пытаньне аб прамфінпляне **Пытаньне аб прамфінпляне — першачарговае пытаньне.** Наша партыя займаецца ім увесь час. Мы пазінны ўпарта змагацца за выкананьне і магчымае перавыкананьне вытворчых праграм прамысловасьці. Перамога на гэтым важнейшым вучастку будаўніцтва, далейшае паступальнае разьвіцьцё прамысловасьці, у першую чаргу — цяжкае індустрыі, ёсьць узмацненьне пралетарскай дыктатуры ў нашай краіне. З пільнай увагай мы павінны сачыць за работай нашай прамысловасьці, усямерна ёй дапамагаючы, усямерна змагаючыся з усім тым, што перашкаджае яе рабоце, усямерна скарыстоўваючы і арганізуючы вялізны творчы энтузіязм рабочых мас.

Стан і далейшыя задачы калектывізацыі сельскае гаспадаркі

Прычыны выхадаў з калгасаў

Дзе зараз становішча з калектывізацыі сельскае гаспадаркі ў Беларусі? Гаміня зводзі гаварыць, што, калі дзён таму назад процант беднякоў-сераднякоў гаспадарак у калгасах даў 56, дык зараз гэты процант на паменшыўся. Чым тлумачыцца гэта? Тут, таварышы, бязумоўна ёсьць многія прычыны. Недахопы ў работы з апорай рабочае клясы ў вёсцы — вясковай бедняцкай, недахопы ў масавай работы ў вёсцы могуць мець сялянак, асабліва ўзрослае і таючая актыўнасьць кулацтва, кулацтва, якое ня спіць, як гадзіна, проста, так і ўлазіць сваіх шчупальцаў, падкулачнікаў. Тут дзейнічае дзелі рад іншых фактараў. Хісткасьць серадняка на фоне ўзрослай актыўнасьці кулацтва, бязумоўна, адіграе і немалую ролю ва ўсім працэсе выхаду з калгасаў. **Але галоўным чынам** разьвіцьця калгаснага руху бязьспрэчна зьяўляецца перагібы, скажэньні агульнай лініі пры работе на калектывізацыі бядняцка-сераднядкіх мас.

Чыны адсеў ідзе імкнена за кошт бяднякоў, за кошт пазорных калгасаў і дробных калгаснікаў, якія былі вопны рух батрацка-бядняцкіх і сераднядкіх мас у калгасы. І толькі таму, што ў радзе месц мы не змаглі гэты рух скарыстаць, замацаваць, арганізаваць, толькі таму зараз маюць месца адсевы і разабагуленьне. Клясавы вораг, а якім мы за гэты час вялі і відзем жорсткую барацьбу, бачачы, што прыходзіць канец яго эканамічнаму існаваньню, яго сытаму жыцьцю, скарыстаў усе сродкі, каб пахіснуць серадняка ад калгасу, ад рабочай клясы, ад нашае партыі. І ў радзе месц, дзе былі перагібы, дзе ня было масавай работы, дзе ня было работы з беднатой, дзе не зварачалася ўвага на гаспадарчае ўзмацненьне калгасаў, кулаку ўдавалася ў поўнай ступені дасягнуць сваёй мэты. А мы ў радзе месц «скарыстоўвалі» гэты масавы рух бядняцка-сераднядкага сялянства праз падсьцёгваньне, адміністрацыйным парадкам. Замест работы з беднатой і батрацтвам, замест таго, каб мець актыўнае падтрыманьне на сходах беднаты і батрацтва, пры арганізацыі калгасаў, пры раскулачваньні, было шмат фактаў, калі нашы таварышы прыяжджалі, склікалі сход, галасавалі—хто за — руку ўздымаюць некалькі асоб, хто супроць — нікога, значыць прапанова прымаецца і... калгас арганізаваны, а таварыш паехаў далей. Пад вечар такі таварыш разважаў: «я сёньня арганізаваў тры калгасы, па дарозе арганізую яшчэ чацьверты».

Але ці можна лічыць, што ў нас масавы калгасны рух цалкам падменены адміністраваньнем? Ні ў якім разе; так думаць было-б шкодна. Аб гэтым лепш за ўсё сьведчаць факты. Там, дзе было менш адміністраваньня і перагібаў, там мы мелі меншы адсеў. **Там, дзе перагібы хутка выпраўлены, там, дзе прайшлі на новы статут, дзе гаспадарчы бок справы, гаспадарчыя пераважнасьці калгасаў перад індывідуальным гаспадараньнем відавочны для бядняцка-сераднядкіх мас, там ужо ёсьць новы прыліў у калгасы.** У бліжэйшыя часы мы без сумненьня будзем мець новую хвалю яшчэ большага руху бядняцка-сераднядкіх мас у калгасы.

Перагібшчыкі і „супраціўленцы"

Пасьля пастановы ЦК партыі аб выпраўленьні перагібаў і скажэньняў партыйнай лініі, мы маем шмат фактаў супраціўленьня правядзеньню ў жыцьцё гэтае пастановы. Часьцей за ўсё гэтае супраціўленьне мае месца якраз з боку тых, якія асабліва з запалам карысталіся мэтадам адміністраваньня і прымусу.

Усім вядома «шклоўская» справа. Можна назваць яшчэ некалькі такіх «спраў». Мне думаецца, што даволі многа месц можна знайсьці, дзе паасобныя камуністы, якія праводзяць работу па калектывізацыі і дапусьцілі перагібы, зараз недаволены тым, што партыя рэзка асадзіла перагібшчыкаў для таго, каб прымусіць іх праводзіць лінію партыі. Гэтае незадавальненьне выяўляецца часта ў разважаньнях аб тым, што пастанова ЦК і артыкул т. Сталіна быццам-бы «садзейнічалі адлівам з калгасаў і разабагульваньню», што «трэба было гэту пастанову і артыкул раней прадыскусаваць». Вось у якім напрамку зараз дзейнічаюць «супраціўленцы». Зразумела, што яны вельмі туга перахадзяць на выпраўленьне сваёй лініі, на ліквідацыю перагібаў. Зразумела, што такіх «работнікаў» трэба ня толькі асадзіць, але і біць з усёй бальшавіцкай бязьлітаснасьцю. **Бо асноўнае зараз — гэта хутчэйшае выпраўленьне перагібаў, перавод калгасаў на новы статут, безадкладная самая інтэнсыўная работа па падрыхтоўцы да сяўбы. І хто гэтага не разумее, а тым больш хто супраціўляецца, або сабатуе гэтыя пастановы вышэйшых партыйных органаў, таго трэба безадкладна зьнімаць з работы, прыцягваць да адказнасьці.**

Наглядаецца таксама ў радзе месц і замяшанасьць. Яна выяўляецца ў тым, што таварышы ня ведаюць, што рабіць. «Пазаўчора арганізаваў калгас, сёньня часта калгаснікаў з калгасу выходзіць, затрымліваць яе — будзе перагіб, застануся лепш я ў баку, няхай усё ідзе, як ідзе». Па такіх настроях таксама трэба біць з усёй рашучасьцю. Пасьпяшаньць і замяшанасьць у нашых радох — г. зн. свабода дзеяньня для кулака той лыжкі вады на млын клясавага ворага.

Ёсьць і такія «філёзофскія» разважаньні: «могуць быць выпадкі, што лінія ў тых ці іншых мясцох скажалася, але як пры такой вялізарнейшай справе можна адразу добра праводзіць работу і, ня маючы вопыту, ня мець памылак?» А пакуль займаюцца такой «філёзофіяй» перагібаў не выпраўляюць, калгасаў не ўзмацняюць, з беднатой работы не вядуць. Гэтым, зразумела, карыстаецца клясавы вораг.

Аб клясавай барацьбе на вёсцы

Трэба сказаць, што клясавая барацьба на вёсцы зараз набывае вельмі цікавыя формы. Калі ў нас было 56 проц. бядняцка-сераднядкіх гаспадарак у калгасах, то зараз у некаторых мясцох у калгасах засталася меншасьць вёскі. У раёнах хутарскога землякарыстаньня, напрыклад, адзін хутар увайшоў у калгас, другі не ўвайшоў; паміж калектывізаванымі хутарамі засталіся хутары не калектывізаваныя. Часта ўзьнікаюць пытаньні аб тым, як скарыстаць у такіх выпадках зямлю, як яе засяваць і г. д. Пры направільных пастановах, пры няўмелай арганізацыі тут можа стварыцца такое становішча, што мы будзем мець вялікія непаразуменьні пры сяўбе. Кулак, зразумела, будзе выкарыстоўваць такія непаразуменьні. Ён, напрыклад, пойдзе (і ідзе) на тое, каб «дапамагчы» бедняком і сераднякам, якія не ўвайшлі ў калгасы, грашыма і г. д. Той кулак, які застаўся, таксама і падкулачнікі будуць усімі мерамі садзейнічаць ускладненьню становішча, тэрорам, падпалам, распаўсюджаньнем розных чутак, удзелам у контр-рэвалюцыйных шпіёнскіх арганізацыях.

Зразумела, бядняк на бедняка і сераднік на серадняка пайсьці ня могуць таму толькі, што адзін у калгасе, а другі не ў калгасе. Але няўмелае правядзеньне работы можа выклікаць непаразуменьні пры зямляўпарадкаваньні і пагогул усялякія ўскладненьні. Ужо ёсьць падставы — для таго, каб канстатаваць магчымасьць такіх ускладненьняў.

Цікава таксама адзначыць, што па працягу ўсяго часу бурнага росту калгасаў мы мелі вялікую актыўнасьць з боку жанчын-сялянак. Там, дзе толькі былі выступленьні супроць мерапрыемстваў па абагуленьні насеньня і г. д., там жанчыны былі ў першых радох. На вялікі жаль, трэба канстатаваць, што было значна менш выпадкаў, калі жанчыны сталі ў першых радох за ўваходу калгас, за абагуленьне, за раскулачваньне. Адсюль, зразумела, нельга рабіць вывад, што мы маем у вёсках пагогул рэакцыйныя жаночыя масы, але трэба асабліва падкрэсьліць, што наша работа сярод жанчын-сялянак была агідна слабой. Там, дзе групы беднаты і іншыя нашы арганізацыі на вёсцы займаюцца гэтай справай, як належыць, дзе яны імкнуцца мець у бядняцка-сераднядкіх жаночых масах апору, дзе яны арганізавалі вакол сабе актыў з батрачак і бяднячак, там такое становішча ліквідуецца.

Наўкола сучаснага становішча з калектывізацыяй, зразумела, заварушыліся ва ўсю і правыя і «левыя». Сёньня лёзунг правых: «давайце адступаць, бо вось, бачыце, адліў, сераднік хісьнуўся, вось ідзе разабагуленьне, значыць, — патрэба пазіжэньня вытворчасьці, давайце пажывем яшчэ некалькі год з індывідуальнымі гаспадаркамі, ня будзем зараз ставіць пытаньня аб замене вытворчасьці кулацкіх гаспадарак вытворчасьцю калгасаў». З другога боку «левыя» — «гані на чым папала! Маса яшчэ не разумее, яна яшчэ не дарасла, вось давай я падганю, а потым ужо і самі беднякі і сераднякі зразумеюць карысьць калгасаў».

Перагібы былі ва ўсіх звеньнях: і ў вёсцы, і ў раёне, і ў акрузе, і з боку некаторых працаўнікоў цэнтральных устаноў. У вёсцы — практычна гнулі, у раёне — «дапамагалі» парадамі, благаславеньнямі і практычнай дапамогай, у акрузе — кантрольнымі лічбамі, падсьцёгваньнем — вось, моў, той і той ідзе ўперад, а ты адстаеш! І часта, там, дзе былі перагібы, заместе таго, каб іх выправіць, замазвалі іх, як гэта зроблена Магілёўскім акругкомам партыі. 20 дзён мазалі і не маглі паставіць пытаньня, як належыць! У Мазырскай акрузе ўмудрыліся за які-небудзь месяц процант калектывізацыі акругі дагнаць да 92. А цэнтральныя ўстановы? Народны камісарыят аховы здароўя цалічку для сябе абавязкам «займацца» ліквідацыяй кулацтва, як клясы, і даў дырэктыву аб тым, што сялянам забараняецца прадаваць прадукты на рынку з вазоў. Народны Камісарыят Гандлю гэта пацьвердзіў, Калгасцэнтр, які раней даў дырэктыву аб абагуленьні птушак, пасьля пастановы ЦК партыі аб барацьбе з перагібамі, даў на месцы тэлеграму, каб усе ранейшыя яго дырэктывы па калектывізацыі лічыць адменемымі. Такім чынам, перагібы і скажэньні маюць месца ва ўсіх зьвеньнях нашага апарату. Трэба сказаць, што і друк наш не даволі папулярызаваў пастановы партыі супроць перагібаў, не даволі сыгналізаваў аб іх, не даволі папулярызаваў артыкул т. Сталіна. І ў нашым друку былі факты невыстарчальна ясных установак. Я павінен падкрэсьліць, што орган Цэнтральнага Камітэту партыі, газэта «Зьвязда», увесь час праводзіць у асноўным правільную бальшавіцкую лінію.

Гаворачы аб цамылках, аб перагібах, аб праяўленьні праваапартуністычнай практыкі на мясцох, паказаючы іх сапраўдныя карэньні, я гэтым падкрэсьліваю яшчэ раз неабходнасьць жорсткага змаганьня супроць усіх гэтых скажэньняў партыйнай лініі. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б сваячасова завастрыў увагу партыйных арганізацый на неабходнасьці строгага захаваньня добраахвотнасьці, на арганізацыю арцеляй як жорсткага змаганьня супроць усякіх спроб раскулачваць серадняка, на неабходнасьць замацаваньня посьпехаў калгаснага будаўніцтва. Але-ж мы павінны адкрыта і проста сказаць, што мы ў непастрачальнай меры апазьдалі аб тым, што трэба абагульваць толькі рабочую і тавара-прадукцыйную жывёлу.

Становішча з раскулачваньнем. Былі факты, на жаль не адзінкавыя, «раскулачваньня» серадняка. І ў сувязі з тым, што яго ў некаторых мясцох «раскулачылі», пазбавілі права голасу, пазбавілі права ўступленьня ў калгас, у сувязі з тым, што некаторую частку сераднякоў адміністрацыйна прымусілі ісьці ў калгас, мы маем, як ужо я сказаў, у адзаведнай праслойцы серадняка хістаньні. Трэба мець на ўвазе, што гэта зьвяшчасова, яно будзе зьнішчана ў бліжэйшым часе адпаведнай работай, адпаведным выпраўленьнем таго, што было зроблена дрэннага. Усім няправільна раскулачаным сераднякам гаспадаркам павінна быць неадкладна вернута маемасьць, якая была забрана. Выпраўленьнем перагібаў, якія мелі месца пры калектывізацыі, гэтыя хістаньні серадняка будуць зьнішчаны.

Мелі месца факты раскулачваньня гандляроў і саматужнікаў у мястэчках і гарадох, якія (гандляры і саматужнікі) ня былі зьвязаны з сельскай гаспадаркай і не падыходзілі пад катэгорыю кулакоў. Адначасова з гэтым трэба адзначыць, што мелі месца і факты абароны кулака па розных прычынах. То кулак зьяўляўся сваяком члена партыі, то блізкім знаёмым. Мела месца абываталькае спачуваньне кулаку. Таксама былі выпадкі спачуваньня кулаком, якіх высялялі.

У сувязі з гэтым трэба сказаць аб беларускім нацыянал-дэмакратызьме і беларускім нацыянал-фашызьме. Мы ня раз гаварылі, што беларускі нацыянал-дэмакратызм зьяўляецца для нас найбольш небясьпечным з усіх шавінізмаў, бо база для яго непараўнальна больш моцная на Беларусі. Гэта база — беларускае кулацтва і буржуазія, буржуазія, кулацтва і нацыянал-фашыстыя Заходняй Беларусі. Таму трэба весьці рашучую барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам у першую чаргу, не паслабляючы адначасова барацьбы і з іншымі шавінізмамі. Зараз, пры ліквідацыі кулацтва, як клясы, у сувязі з суцэльнай калектывізацыяй, мы маем адбітні гэтай барацьбы сярод ідэалёгаў беларускага кулацтва — нацыянал-дэмакратызм. Унутры партыі мы маем спробы актывізацыі нацыянал-апартуністых. Капіталістычны сьвет узмоцнена рыхтуецца да нападу на Савецкі Саюз. Трэба быць гатовымі на тое, што ў гэтай барацьбе капіталістымі, як і ў мінулым, будуць выкарыстаны ўсе магчымасьці, прыцягнуты ўсе «сілы». Беларускія нацыянал-фашыстыя ў Заходняй Беларусі, ідэалёгі беларускай буржуазіі і кулацтва Заходняй Беларусі, якія зьяўляюцца вернымі паслугачамі польскага фашызму, якія прымаюць энэргічны ўдзел у падрыхтоўцы да вайны супроць Савецкага Саюзу, стараюцца стварыць адзіны фронт з нацыянал-дэмакратамі Савецкай Беларусі для барацьбы з Савецкім Саюзам. Трэба ўзмацніць барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам.

ЦК ня раз падкрэсьліваў, што мы маем такое дробна-буржуазнае акружэньне, якое моцна націскае на партыйную арганізацыю, на паасобныя элементы, якія падпадаюць хістаньням. Гэты націск выклікае з боку паасобных членаў партыі небальшавіцкіх, некамуністычныя, анты-партыйныя паводзіны. Тав. Сталін на адным з апошніх пленумаў ЦК УсеКП(б) гаварыў аб тым, што мы ня можам пачаць выкананьне пляну вялікіх работ, ня можам пайсьці на карэнную перабудову сельскае гаспадаркі, покуль мы не вычысьцімся і не самаачысьцімся ад усяго варожага, чужога, разлажыўшагася. Мы партыйную арганізацыю начысьцілі. Як паказаў зараз вопыт калектывізацыі і ліквідацыя кулацтва, як клясы, тут пройдзена яшчэ толькі частка шляху. Праблема ліквідацыі кулацтва, як клясы стаіць перад намі і надалей. Вялізныя задачы стаяць у гэтым напрамку перад намі. Як паказаў вопыт, паасобныя праслойкі нашай партарганізацыі аказаліся, недастаткова бальшавіцкі загартаванымі. Адсюль далейшая задача — самаачысткі нашых арганізацый, бальшавіцка-ленінскага выхаваньня членаў нашай партыі. Трэба сказаць, што чыстка партарганізацый вельмі дапамагла справе. Ачышчаньня арганізацыі з большым посьпехам працавалі і па калектывізацыі і па іншых галінах.

Затое неачышчаная камсамольская арганізацыя дала аб сабе ведаць. Мы маем вельмі шмат выпадкаў некамуністычных, непралетарскіх паводзін в боку цэлага раду камсамольцаў і кіраўніцтва паасобных камсамольскіх арганізацый. Камсамольскае кіраўніцтва ў некаторых мясцох аказалася нікуды нявартым у сэнсе правядзеньня лініі партыі.

Кулак супраціўляўся і супраціўляецца не на жыцьцё, а на сьмерць. Былі выпадкі забойстваў кулакамі непасрэдна, былі выпадкі падпалу кулакамі несрэдна, але кулак імкнуўся, як мага, скарыстаць сваіх сваякоў, падкулачнікаў, а таксама жаночую частку кулацтва — жонак, дачок і інш.

Мы мелі ахвяры з боку членаў партыі, якія працуюць у вёсцы, якія пасланы на работу ў вёску ў парадку мабілізацыі, з боку рабочых брыгадзіраў, з боку актывістых-беднякоў, сераднякоў і батракоў, асабліва з боку батракоў і беднякоў, з боку калгаснікаў. Зразумела, мы не маглі і ня можам не адказваць на гэтую адкрытую шалёную барацьбу, на барацьбу жалезам і агнём толькі мерамі прафілактычнымі. Мы падаўлялі і жорстка будзем падаўляць усякае супраціўленьне кулацтва. Фарпост Савецкага Саюзу, якім зьяўляецца БССР, павінен быць ачышчаны ад усяго, што шкодзіць пралетарскай дыктатуры.

Нашы задачы

Наша далейшая работа і нашы далейшыя задачы. Самае грунтоўнае. Без выпраўленьня перагібаў, без барацьбы супроць «супраціўленцаў» правядзеньню лініі партыі нельга рухацца далей. Усе сілы арганізацыі трэба кінуць на гэтую барацьбу, на ўмацаваньне калгасаў, на тэрміновы перавод калгасаў на новы статут, на далейшае добраахвотнае будаўніцтва калгасаў. Такое пытаньне пленум паставіў з усёй рашучасьцю перад усімі арганізацыямі КП(б)Б.

У сувязі з тым, што пытаньне аб добраахвотнасьці калгаснага руху, як аказваецца, выклікае цэлы рад нясьпасьцій у некаторых мясцох, я прымушаны на ім спыніцца асабліва. Што значыць добраахвотнасьць? Калі аб гэтым гаворыць абываталь — гэта адно, калі гаворыць прадстаўнік буржуазіі — гэта другое і калі аб гэтым гаворыць бальшавіцкая партыя — гэта трэцяе. Таму трэба заўсёды памятаць, калі справа ідзе аб добраахвотнасьці, што мы жывем у Савецкім Саюзе, дзе кіруе камуністычная партыя, дзе ўсё, што ў нас робіцца, робіцца ў інтарэсах рабочых, беднякоў і сераднякоў. Таму ў нас ня можа быць такога становішча, каб мы былі прымушаны ў адносінах да працоўных мас дзейнічаць прымусам для таго, каб праводзіць нашу палітыку ў сацыялістычным будаўніцтве для таго, каб пабудаваць сацыялізм. Гэта было-б проста дзіка. Мы арганізуем масы, узьнімаем самасьвядомасьць іх для таго, каб гэтыя масы ўявілі сабе лінію і канкрэтныя задачы. Пасьля гэтага масы лавінай ідуць за намі; гэта мы бачым на кожным кроку. Але, калі мы, замест масавай работы прыходзім да мас і кажам: «вы дурні, вы пакуль што нічога не разумееце ў карысьці калгасаў, а таму мы вас сілай прымусім ісьці, вы потым зразумееце гэту карысьць і вам будзе добра»—такі падыход да мас інфачай, як «прышыбеяўскім», назваць нельга.

Мы ніколі і нідзе не адмаўляліся і не адмаўляемся рашуча праводзіць ідэалёгічнае ўзьдзейнічаньне, мы ніколі не адмаўляліся і не адмаўляемся гэтую магутную зброю па-бальшавіцку трымаць і мабілізаваць ёю шырокія працоўныя масы на будаўніцтва сацыялізму, на індустрыялізацыю, на калектывізацыю. І гэту нашу магутную зброю мы даем у рукі саміх мас і выклікаем тое, што маса ідзе за намі, толькі пасьпявай не арганізоўваць. Таму пустой гутаркай зьяўляюцца «філёзофскія» разважаньні на тэму аб добраахвотнасьці. Не падмяняць адміністраваньнем, адміністрацыйным самавольствам работу з масай, зацікавіць масы ўступіць у калгас паказам лепшага гаспадарчага становішча пры калгасах, паказам таго, што карова дае ў калгасным кляве больш малака, што ўраджай у калгасе больш, чымся ў індывідуальнай гаспадарцы, што калгаснік мае магчымасьць і культурна пажыць, адпачынак атрымаць за кошт рацыяналізацыі працы і г. д. Гэта будзе лепшым спосабам прыцягненьня самых шырокіх бядняцка-сераднядкіх мас у калгасы.

Трэба з усёй рашучасьцю заявіць, што цэлы рад дэфэктаў мы маем у рабоце з беднатой, што ва многіх мясцох няма груп беднаты, што гэтыя групы беднаты ў вёсцы працуюць дрэнна і што зараз на работу з беднатой павінна быць зьвернута асаблівая ўвага, як на самы галоўны сродак для правядзеньня працы па калектывізацыі. У сувязі з гэтым стаіць і пытаньне аб правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі. Трэба сказаць, што гэтае пытаньне зараз ускладнілася, дзякуючы таму, што індывідуальны сэктар ня быў над належным нашым наглядам да гэтае пары. **Пытаньне правядзеньня веснавога засеву зьяўляецца важнейшым і ад вырашэньня гэтага пытаньня ў значнай ступені будзе залежаць далейшая праца па калектывізацыі.** І пакольні індывідуальны бядняцка-сераднядкі сэктар у надыходзячай сяўбе займае вельмі значнае месца, настолькі- наша ўвага, нашы сілы, дапамога яму павінны быць забясьпечаны.

Асабліва востра паўстае задача барацьбы з рознымі адхіленьнямі ад правільнай лініі партыі. Правая небясьпека зьяўляецца галоўнейшай. Яна нам заўсёды шкодзіла, а зараз можа пашкодзіць яшчэ больш. Таксама стаіць справа і з «левымі» загібшчыкамі, якія зараз зьяўляюцца лепшымі дапаможнікамі правых ухілістых. Выходзячы з сучаснага становішча, нам трэба зараз задачы чысткі камсамолу, чысткі савецкіх, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый паставіць, як мага больш рашуча. Трэба сказаць, што мы пакуль што ў нашых савецкіх установах амаль нідзе, як належыць, чыстку не правялі. Напрыклад,—чыстка ў ЦСУ, гэта-ж была гульня ў біруль-ку, а ня чыстка. Зараз задача чысткі стаіць перад намі, як вялізарнейшая задача для таго, каб пры далейшым этапе ў справе калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, мы маглі-б падыйсьці да гэтай справы больш падрыхтаванымі і ўзброенымі ўсім нашым апаратам, чым гэта было да сучаснага моманту. Таксама пільна мы павінны адносіцца да справы сыстэматычнай самаачысткі партыйных радоў.

Нам трэба значна глыбей і шырэй паставіць справу папулярызацыі настаноў партыі, якія зводзяцца да неабходнасьці барацьбы за лінію партыі, супроць ня скрыўленьняў, супроць перагібаў. Таксама мы павінны шырока папулярызаваць мерапрыемствы эканамічнага парадку, накіраваныя на ўзмацненьне і разьвіцьце калгаснага руху. За апошні час выданы рад настаноў і распараджэньняў партыі і ўраду аб розных новых ільготах калгасам і калгаснікам, а таксама і індывідуальным бядняцка-сераднядкім гаспадаркам. Усе гэтыя рашэньні павінны неадкладна даводзіцца да ведама самых шырокіх мас працоўных.

Таварышы, калі будуць хутка выпраўлены ўсе перагібы і скажэньні лініі нашай партыі, калі бядняцка-сераднядкае сялянства будзе ведаць аб тых ільготах і тэй дапамозе, якую яму аказваюць урад і наша партыя, калі ўнутры нашай партыі, у барацьбе за правільную лінію партыі, мы будзем даваць рашучы адпор як правым ухілістым, так і «левым» загібшчыкам, калі мы будзем ва ўсякі час падрыхтаванымі адбіць шалёны напад на СССР, які падрыхтоўваюць імпэрыялісты, тады справа індустрыялізацыі нашай краіны, справа суцэльнай калектывізацыі і, на яе аснове, канчатковая ліквідацыя кулацтва, як клясы, справа выкарчоўваньня карэньняў капіталізму ў нашай краіне будзе забясьпечана. (Воплескі).

НА ПАРТНАРАДЗЕ ПА ПЫТАНЬНЯХ НАРОДНАЙ АСЬВЕТЫ

Дрыхтаваць кадры, патрэбныя сацыялістычнаму будаўніцтву

Аб сыстэме народнае асьветы

З дакладу тав. Платуна

Красавіка адкрылася ўсебеларускай партыйная нарада па пытаньнях народнае асьветы. З дакладам аб сыстэме народнае асьветы выступіў НКА т. **Платун.**

Нам у першую чаргу трэба набудаваць адзіную сыстэму народнае асьветы—кажа т. Платун. Сыстэма народнае асьветы павінна будавацца так, каб наша школа давала агульную адзіную асьвету, паводле праграмнай роўкі нашай партыі, каб яна заспявала запрагабаванні рэканструктыўнага перыяду сацыялістычнага будаўніцтва патрэбнымі і па колькі, і па якасьці кадрамі. Важнейшае значэньне для павінае асьветы мае ўдзел усяе школы разам з выкладчыкамі і вучнямі) у дзікай рабоце, у рабоце саветаў, камітэтаў, розных дзяржаўных органаў, прафсаюзаў і інш.

Для гэтых установак і павінна будавацца сыстэма народнае асьветы. Чым, што формы гэтай сыстэмы ня быць наступнымі: дашкольны сад, школа фабрычна, заводзе і сяўгасе і г. д. для дзяцей дашкольнага ўзросту 4-х да 8 год уключна, гэта знаходзіцца павінна знаходзіцца ў дадзай установе 4 гады. Масавая пачатковая 7-мігадовая школа з двума ступенямі—першы канцэнтр—4 гады і 3 гады. Тут, у 7-мігадовай школе, павінна знаходзіцца да 15 год. Пры чым, другі канцэнтр, у гарадзкі, галоўным чынам, ад тусеткі, можа быць адзьдзелены ад 4-га канцэнтру. 7-мігадовая школа на даваць дзецям працоўных непасрэдна на прадпрыемстве, заўсёды калгасе і ў выхадных выніках, і семагчыма будзе па мясцовых умовах праводзіць гэту працу на прадпрыемствах, неабходна арганізаваць школах спэцыяльныя майстэрні, а-жа працоўных павінна ў дзіцяна ўвязваецца з агульна-палітэхнічнае асьветай.

Пасьля з тым работа 7-мігадовай школы комплексна павінна ўвязваецца з агульнай палітасьветнай работай дзяцей.

Другая школа і другая ступень (3-мігадовая) працоўная палітэхнічная школа, апрача агульнае палітэхнічнае, павінны забясьпечыць сацыялістычнае будаўніцтва неабходнымі нам ад сярэдняй кваліфікацыі і зьяўляюцца базай для камплектаваньня. У. Пры чым, скончыўшы сярэдняй школу, можна паступіць у ВНУ пасьля пэўнага часу і працы на ўзрасьці, пэўнага працэнтнага стажу.

І такой школы могуць быць працфэсыянальна-палітэхнічная школа, фабрычна-заводская вучнёўства, школа калгаснай моладзі, трэці канцэнтр (8-10) групы 10-мігодкі, які павінен быць аддзелены ад 7-мігадовай школы. Такая установка аб сярэднім зьвяне школы зусім не пярэчыць прынцыпу палітэхнічнае школы, а наадварот, стварае адзіную сыстэму працоўнае палітэхнічнае школы.

Мы лічым, што тэрміны навучаньня ў сярэдняй школе трэба устанавіць у залежнасьці ад таго, якога спэцыяліста мы выхуем, г. зн. прыкладна так, як устаноўлена пастановамі ліпнёўскага і лістападаўскага пленумаў ЦК УсеКП(б) у адносінах да вышэйшай школы.

Канкрэтна мы прапануем такія тэрміны:—два—2½ гады для тых школ, якія рыхтуюць вузкага спэцыяліста і «тэхніка функцыянала» і трох—3½ гадовае навучаньне для тых, якія выпускаюць «тэхнікаў-канструктараў».

Што датычыцца вышэйшай школы, як устаноўлена пастановаю ліпнёўскага і лістападаўскага пленумаў ЦК УсеКП(б), яна павінна быць з 3-х—4 гадовым курсам навучаньня.

Далей т. Платун спыняецца на дадатковай сыстэме асьветы для дарослых і падростаў.—Гэтая сыстэма структурна павінна будавацца наступным чынам: павінны быць рабфакі і калфакі дзённыя і вячэрнія, якія падрыхтоўваюць рабочых, батракоў, беднякоў і калгаснікаў у ВНУ. Тэрмін навучаньня на рабфаках і калфаках—3½—5 год.

Наступная форма—прафшкола ці ФЗВ на базе 4-хгодкі, тэрмін навучаньня—тры гады. Такая прафшкола ці ФЗВ павінна даваць агульна-адукацыйныя веды за сямігодку.

Трэцяй формай зьяўляецца вячэрняя рабочая, калгасная і сяўгасная школа на базе 4-хгодкі, далей—вячэрнія прафэсыянальна-палітэхнічныя школы на базе сямігодкі, вячэрніх школ і прафшкол на базе 4-хгодкі. І апошняя—вячэрняя ВНУ з тэрмінам навучаньня—4—5 год.

Тав. Платун падрабязна спыняўся на заочным навучаньні, якое павінна даваць, папершае, агульнае ўзьвышэньне і падвышэньне кваліфікацыі па тэй, ці іншай галіне, ці шэйшую прафэсыянальна - тэхнічную асьвету.

Спрэчкі па дакладу тав. Платуна

У чорна раніцінім пасяджэньні па дакладу т. Платуна разгарнуліся шырокія спрэчкі. Першым выступіў **т. Панкевіч** (БДУ). Ён гаварыў, што палітэхнічная школа павінна будавацца на базе буйное вытворчасьці, пры чым вытворчасьці сацыялістычнай. Дробная вытворчасьць зьяўляецца базай прафтэхнічнае асьветы. Палітэхнічная школа павінна вывучаць працэсы буйное вытворчасьці. Вывучэньне вытворчасьці разам з практычнай работай зьяўляецца асновай палітэхнізацыі школы. Прафэсыянальна-палітэхнічнае выхаваньне—зусім рэальная рэч. Да 17-ці год павінна быць палітэхнічнае выхаваньне, а далей—прафэсыянальна-палітэхнічнае.

Тав. Шчарбакоў (культпроп КП(б)Б) асноўным недахопам лічыць тое, што сярэдняя школа адарвана ад вытворчасьці. Нам патрэбны вялікія тэхнічныя сілы. Тав. Шчарбакоў асабліва падкрэсьлівае неабходнасьць скарыстаньня жаночай сілы. Пытаньне аб рэканструкцыі нашага быту—надзённае пытаньне. І тут нельга не гаварыць аб пытаньні дашкольнага выхаваньня. Тут трэба гаварыць ня толькі аб павял

Лепшую працоўную моладзь—у вайсковыя школы

ВЯРБОЎКА ПРАХОДЗІЦЬ СЛАБА

Задача яшчэ ня выканана

Трэба адзначыць, што вярбовачная кампанія ў вайсковыя школы разгортваецца вельмі нездавальняюча. Галоўнай небясьпекай трэба лічыць тое, што вакол гэтай кампаніі ня створана грамадзкая думка. Акруговыя вярбовачныя камісіі ў большасьці свае́й не давялі вярбовачную кампанію да пізавых масавых арганізацый—да цэху, саўгасу і калгасу. Ёсьць толькі агульныя пастановы, няма канкрэтных мерапрыемстваў, няма тэмпаў у рабоце як у галіне вярбоўкі, так і ў працы курсаў з кандыдатамі ў вайсковыя школы.

Такое становішча трэба лічыць зусім ненармальным, калі ўвага да пытаньняў абароны краю падрыхтоўкі кадраў павінна быць значна ўзмоцнена.

Парторганам на мясцох—райкомам і ячэйкам—трэба зараз-жа арганізаваць праверку работы вярбовачных камісій, работы курсаў па падрыхтоўцы, праверыць, як мабілізавана пралетарская грамадзкасьць вакол вярбоўкі. Трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на пільны адбор кандыдатаў, рашуча вядучы барацьбу з недаацэнкай патрабаваньняў, якія прад'яўляюцца да кандыдатаў (сацыяльны склад, вытворчы стаж, агульная падрыхтоўка).

Некаторыя работнікі лічаць, што з прычыны недахопу кваліфікаванай рабочай сілы на прадпрыемствах нельга пасылаць кваліфікаваных рабочых у школу.

Такія настроі зьяўляюцца надзвычай шкодлымі і зьяўляюцца простай недаацэнкай важнейшых задач, пастаўленых партыяй перед РСЧА ў справе падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў вайсковых спэцыялістых.

Трэба ў клюбах, чырвоных куткох вывесіць правілы прыёму ў вайсковыя школы, рабіць кансультацыі, даваць спраўкі і г. д.

Камсамол і Асоавіяхім павінны выказаць максымальную энэргію да таго, каб зараз-жа, да пачатку работы курсаў былі абраваны кандыдатуры на камсамольскіх сходах. Камсамол павінен выканаць тыя абавязкі, якія ён узяў на сябе ў справе камплектаваньня вайсковых школ.

Гэтыя мерапрыемствы павінны быць зараз-жа ўжыты, як вярбовачныя камісіямі, так і мясцовымі партыйнымі камсамольскімі і асоавіяхімаўскімі арганізацыямі. Усякае спазьненьне пагражае арыпам найважнейшай палітычнай кампаніі.

Н. КОНЮХАЎ.

Толькі пачынаюць працаваць

Менская акруговая камісія па вярбоўцы ў вайсковыя школы толькі некалькі дзён таму назад са спазьненьнем прыступіла да работы.

На гэта першае і вельмі важнае паседжэньне камісіі прадстаўнік ЦКПСБ не зьявіўся.

Вярбовачная камісія пастанавіла стварыць гарадзкую і раённыя вярбовачныя камісіі, разьмеркавала месцы для ўсяе акругі, паслала разьмеркаваньне райвыканкомам і запрапанавала ім неадкладна арганізаваць раённыя вярбовачныя камісіі.

Камісія зьвязалася з аддзеламі Нарасьветы адносна стварэньня курсаў па падрыхтоўцы. Неабходна адкрыць курсы ў Менску, Барысаве і ў раёнах.

Вярбовачная камісія ставіць пытаньне на прэзыдыуме акрвыканкому адносна забесьпячэньня курсантаў, асабліва батракоў, інтэрнатамі, харчам і ўсімі патрэбнымі падручнікамі да навучаньня на курсах.

Прафсаюзы павінны былі на буйных прадпрыемствах ужо разгарнуць работу па вярбоўцы ў вайсковыя школы.

Камісія даручыла прадстаўніку саюзу с.-г. рабочых праверыць як разгарнулася гэта работа на саюзах. Аднак, у акруговай вярбовачнай камісіі няма ніякіх вестак аб тым, што робіцца ў акрузе і ў Менску па пытаньні аб вярбоўцы ў школы. Камісія ня ведае, дзе выкананы пляны і дзе яшчэ нічога ня зроблена.

Трэба тэрмінова разварушыць прафсаюзы.

Заводзкія арганізацыі, партыйныя ячэйкі на прадпрыемствах павінны шчыльна падыйсьці да гэтай работы. Вярбоўка ідзе павольна, а дырэктыва партыі гаворыць аб неабходнасьці пралетарызаваць нашы вайсковыя школы, стварыць здаровы сацыяльны касьцяк у нашых кузьлях чырвоных камандзіраў.

У бліжэйшым часе вярбовачная камісія наладжвае разам з акругкомам ЛКСМБ вечар з дакладам аб задачах камплектаваньня вайсковых школ.

Трэба тэрмінова прыступіць да галоўнай работы па падрыхтоўцы кандыдатаў у вайсковыя школы, патрэбна пляновая работа на вярбоўцы на буйных фабрыках і заводах, трэба ўзмацніць, і ні ў якім выпадку не паслабляць увагу да вярбоўкі ў вайсковыя школы.

Брыгадзір «Зьвязды».

Рабочую моладзь—у вайсковыя школы

Рашаючую ролю ва ўзмацненьні баяздольнасьці Чырвонай арміі адыгрывае наяўнасьць кадраў палітычна ўстойлівага, падрыхтаванага пачскладу.

Кузьняй камандзіраў зьяўляюцца нашы вайсковыя школы.

ЦК нашай партыі даўно зьвярнуў увагу партарганізацый і камсамолу на камплектаваньне нармальных школ кваліфікаванымі рабочымі кадрамі на павышэньне агульна-адукацыйнай падрыхтоўкі кандыдатаў у вайсковыя школы.

Цяпер у складзе курсантаў усіх вайсковых школ мы маем рабочых 45,3 проц., сялян—42,5 проц. і іншых—12,2 проц.

Камплектаваньне вайсковых школ у 1929 годзе дало рабочых 67,3 проц., сялян—24,2 проц. і іншых—8,5 проц.

ЦК КП(б)Б у сваёй дырэктыве аб вярбоўцы ў вайсковыя школы гаворыць аб неабходнасьці даць у вайсковыя школы 70 проц. кваліфікаваных рабочых. Таксама трэба павысіць процант партыйцаў і камсамольцаў да 75 проц. Камсамол, прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі павінны неадкладна разгарнуць шырокую кампанію на вярбоўцы, каб лепшую частку рабочай моладзі ўліць у нашы кузьні—вайсковыя школы.

М. В.

На БССР

Кукурузу прывезьлі, калі-ж прывязуць кукурузныя малатарні?

„Мудрая" рада Белсельгасснабу

БАБРУЙСК. (Па тэлефону ад наш. кар.). Акрпалаводсаюз атрымаў 10 вагонаў кукурузы, як насеўны матар'ял. Кукуруза будзе сеяцца ў Бабруйшчыне ўпяршыню. Аднак, скарыстаць атрыманую кукурузу, як насеньне, немагчыма, бо яе прыслалі неабмалочанаю. Малатарань-жа для абмалоту кукурузы ня прыслалі.

Белсельгасснаб, куды зьвярнуліся з патрабаваньнем прыняць меры да пасаджэньня адгрузкі кукурузных малатарань, адказаў: «Малацце пакуль што ручным спосабам». Калі выканаць тое, што раіць Белсельгасснаб, дык ёсьць пагроза пасаджаць насеньне, ня лічачы ўжо таго, што гэта вельмі дорага абыйдзецца.

ПРЫЁМ У КААПЭРАЦЫЙНЫ ТЭХНІКУМ

Віцебск. (Наш. кар.). Адкрыт прыём у Віцебскі каапэрацыйны тэхнікум. Будзе прынята 50 чал. Месцы разьмеркаваны па ўсіх каапэрацыйных арганізацыях БССР. Заявы і дакумэнты прымаюцца да 15 красавіка.

ЧЫСТКА БІРЖЫ ПРАЦЫ

Віцебск. (Наш кар.). У выніку праверкі складу беспрацоўных зьняты з вучоту, як няправільна залічаныя, 387 чал.; за адмаўленьне ад работы і хуліганства зьнята з вучоту тэрмінам на адзін год 380 чал. выключана з біржы 120 чал.—былыя гандляры і пазбаўленцы.

Гапавацяпства пры муніцыпалізацыі дамоў

МАЗЫР. (Наш кар.). Караліндскі РВК пры правядзеньні муніцыпалізацыі прыватна - ўласьніцкіх дамоў дапусьціў цэлы рад грубых скажэньняў і парушэньняў рэвалюцыйнай законнасьці. Паводле загаду РВК, былі муніцыпалізаваны незаконна 8 дамоў, якія ня маюць ніякага дзяржаўна - грамадзкага значэньня. У муніцыпалізаваных дамох была забрана ўся абстаноўка, а ў некаторых выпадках пават і хатнія рэчы. Для высяленьня давалася некалькі гадзін. Былі выпадкі, калі зусім не дазвалялі забіраць рэчаў і прымушалі пакідаць іх. Высялялі з дамоў і забіралі рэчы ня толькі ў наймана́ў, а таксама і ў членаў саюзаў і саматужнікаў, якія карыстаюцца правам голасу.

Трэба рашуча спыніць такую незаконную муніцыпалізацыю дамоў і вінаватых у парушэньні рэвалюцыйнай законнасьці прыцягнуць да судовай адказнасьці.

„Культура"—на шыльдзе

БАБРУЙСК. (Наш кар.). У Бабруйску закрылі піўную і адкрылі культурную чайную. Спачатку яна бяэўмоўна адпавядала сваёй назьве. У прыхожай абавязкова распраналіся, у пакоях радыё, газэты, шашкі, шахматы і інш. культурныя забавы.

Але па крысе культура пачала зьнікаць — замоўкла радыё, спачатку яно сапсавалася, а пасьля зусім забралі; зьменшыўся лік газэт; замест былое чыстаты — поўная брыдота, падлога і сталы засьмечаны рознымі адкідамі.

Ад былога засталося толькі некалькі плякатаў на сьценах, і некалькі падраных газэт.

Камісія па аглядзе, зьвярні ўвагу на чайную!

* * *

Бабруйская акруговая камісія па правядзеньні агляду грамадзкага харчаваньня пастанавіла **абвясьціць конкурс на лепшую сталоўку,** чайную і буфэт Бабруйскае акругі. Вызначаны 4 прэміі: 2 на горадзе і 2 па раёнах.

Першая прэмія — 300 руб., другая — 200 руб., трэцяя — 150 руб. і чацьвертая — 100 руб.

А. М.

Да гадавіны сац. спаборніцтва

САМАПРАВЕРКА ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

ЦП саюзаў ня ведаюць, што робіцца на прадпрыемствах

Ні адно цэнтральнае праўленьне саюзу ня ведае, як рыхтуюцца прадпрыемствы да масавай самаправеркі выканаўня прамфінпляну, сацдагавароў і ўдарніцтва, ня гледзячы на тое, што ад пачатку праверкі прайшло ўжо больш 10 дзён.

Белкамітэт саюзу **харчавікоў** лічыць гэта нармальным, апраўдваючыся адсутнасьцю работнікаў. У той-жа час пры Белкамітэце саюзу харчавікоў лічыцца **107 добраахвотнікаў,** якіх можна было-б выкарыстаць для ўдзелу ў праверцы. Але гэта ня робіцца. Бязьдзейнасьць Белкамітэту заражае і нізавыя праф'ячэйкі. На радзе прадпрыемстваў—«Чырвоная Зара», хлебазаводзе, каўбаснай фабрыцы і інш. праверачныя брыгады да работы **яшчэ не прыступілі.**

Белкамітэт саюзу **мэталістых** чакае сканчэньня перавыбараў заўкому. Між тым, на заводзе «Камунар», не чакаючы напамінаньняў Белкамітэту саюзу, па ініцыятыве новага заўкому, створана рабочая брыгада для праверкі выканаўня сацдагавору на «Энэргіі,» з якім «Камунар» спаборнічае. Такім чынам, Белкамітэт саюзу пачынае цягціся ў хвосьце сваіх пізавых праф'ячэек.

У **гарбароў** такі-жа малюнак. Толькі па заводзе «Бальшавік» заўком абгаварыў пытаньне аб самаправеркі. Прымацаваныя да абутковай фабрыкі два брыгадзіры ЦКПСБ на прадпрыемства **яшчэ ні разу не зьявіліся.** У ЦП саюзу гарбароў мяркуюць арганізаваць часовыя кантрольныя камісіі на прадпрыемствах толькі да канца праверкі для надвядзеньня вынікаў.

У ЦП саюзу **транспартнікаў** «напампаваць мясцкомы» мяркуюць толькі 13-га красавіка. І гэты ЦП, між іншым, мае 50 добраахвотнікаў, якія для праверкі не вырыстоўваюцца.

Хэмікі абмежаваліся пасылкай двух прафработнікаў у Гомель і Магілеў. На большае пораху не хапіла.

Але лепш ад усіх «справіліся» дзеравапрацоўшчыкі. Пачаўшы праверку 27-га сакавіка, яны **маюць ужо вывады ад 3-х прадпрыемстваў.** Такі кавалерыйскі тэмп **не гаворыць аб глыбокай праверцы, а галоўнае, аб масавасьці.** І сапраўды, паводле вестак, якія мы маем, брыгадзіры, пасланыя цэнтральным праўленьнем на прадпрыемствы, самі правяраюць выканаўнне сацдагавароў, **ня прыцягваючы рабочых.** Такая «хуткая» праверка горшая ад усякіх адцяжак.

Усё разам узятае сьведчыць аб тым, што цэнтральныя праўленьні саюзаў **не надаюць вялікага значэньня самаправеркі і падрыхтоўцы да гадавіны сацспаборніцтва.**

Прэзыдыуму ЦКПСБ трэба неадкладна праверыць выканаўнне сваіх дырэктыў і дабіцца пералому ў адносінах цэнтральных праўленьняў да падрыхтоўкі да гадавіны сацспаборніцтва.

А. М.

На „Чырвонай Бярэзіне" і „Пралетарскай Перамозе" няма ўдарных брыгад(?)

Падрыхтоўка да гадавіны сацспаборніцтва ідзе слаба

НОВА-БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). На запалкавых фабрыках **«Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская Перамога»** пачалася падрыхтоўка да самаправеркі выканаўня прамфінпляну, сацдагавароў і ўдарніцтва. Пытаньне абгаворана на цэхавых сходах. Абрана часовая кантрольная камісія. Па цэхах абраны спэцыяльныя брыгады для праверкі.

Але брыгадам у справе праверкі ўдарніцтва ня будзе чаго рабіць, бо, паводле вестак рабкораўскай брыгады «Зьвязда», **у большасьці цэхаў** як «Чырвонай Бярэзіны», так і «Пралетарскай Перамогі» **ўдарных брыгад няма.** У некаторых цэхах ударныя брыгады развяліся, а ў некаторых іх зусім і ня было.

Фабрычныя арганізацыі гэтае пытаньне амазваюць.

На заводзе **імя Домбаля** праверка такса́ма разгортваецца марудна. Вылучана ЧКІС, якая работу яшчэ не разгарнула. У адным толькі цэху, ў гуце, дзе добра разгорнута падрыхтоўка да праверкі, **ва ўдарныя брыгады ўпілося яшчэ 5 рабочых.**

На заводзе **«Камінтэрн»** таксама вылучана часовая кантрольная камісія. Праверка ўжо пачалася.

Фабрычныя газэты на «Чырвонай Бярэзіне» ў падрыхтоўцы прымаюць актыўны ўдзел. Выпушчаны спэцыяльны нумар друкаванай газэты, па цэхах выпушчана 7 насьценных газэт. Спэцыяльны нумар газэты таксама выпушчаны на заводзе імя Домбля. У насьценгазэце заводу «Камінтэрн» падрыхтоўка асьвятляецца слаба.

Рабкораўская брыгада «Зьвязды».

Яшчэ не пачалі

На Аршанскай акрузе самаправерка пачынае разгортвацца. Гэтымі днямі на прадпрыемствы пасланы 12 брыгад, якія складзены з прадстаўнікоў ЦКПСБ, акрпрафбюро і камсамолу.

7-га красавіка адбылася пашыраная нарада прафэсыянальнага і камсамольскага актыву. Актыў гаста́ваў абвясьціць красавік ударным месяцам на самаправеркі выканаўня прамфінпляну і сацдагавароў.

Але трэба адзначыць, што на прадпрыемствах падрыхтоўка разгорнута яшчэ **слаба.** Рабочая грамадзкасьць яшчэ ня ўцягнута. Арганізацыі брыгад для праверкі яшчэ не пачаліся.

Брыгадзір ЦКПСБ НАЙКОЎ.

НА СПЛАВЕ

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

З усіх лясных раёнаў Беларусь мае лепшыя ўмовы у адносінах сплаву. ЕССР ня ведае пістачы такелажу, які зьяўляецца цяпер самым вузкім месцам у буйнейшых лясных раёнах. Яна пазбаўлена неабходнасьці завозіць рабочую сілу для сплаву. Рабочай сілы хапае ня толькі для сябе, але і для вывазу ў іншыя раёны. Для забесьпячэньня сплаву вылучаны спэцыяльны фонд харчу і патрэбная колькасьць спэцабутку (19.000 пар ботаў).

СПРЫЯЮЧЫЯ ЎМОВЫ І ДРЭННЫЯ ВЫНІКІ РАБОТЫ

Усё-ж, ня гледзячы на такія спрыяючыя ўмовы, становішча са сплавам ня зусім добрае. Праўда, лес ужо найшоў, але пакуль вельмі павольна. Вялікая колькасьць загатоўленай драўніны знаходзіцца пад пагрозай абсушкі. Ёсьць нават небясьпека, што частка загатоўленага лесу ў готым годзе на заводы не патрапіць.

Такое становішча—зусім спрыяючыя ўмовы і далёка ня добрыя вынікі на мясцох работ—тлумачацца зусім проста.

— Папершае—кажуць кіраўнікі сплаву—перашкаджае малаводнасьць. Недахват вады ў сплаўных рэчках псуе всю справу. Зіма была маласьнежная, а тут яшчэ халады і вятры, якія літаральна п'юць каштоўную ваду.

З гэтае прычыны на дзесятках рэк, як напрыклад на Сушцы, вярхоўі Ольсы, у Бабруйскай акрузе, на Можы, Брусяце, у Барысаўскім раёне, і г. д. стварылася пагражаючае становішча. Зразумела, воду можна было-б затрымаць. Але чым? Ні шлюзаў жа, ні ставаў на нашых лясных рэчках, як правіла, няма. Можна ўжыць брэзэнт, але і брэзэнту це хапае. Мала таго, што яго не хапае, але часта і той, што ёсьць, прысылаецца на месцы з вялікім спазьненьнем. Часткова гэта тлумачыцца тым, што Лесбел пачаў адсылаць яго на месцы работ надта позна. На многіх пунктах, хаця-б Барысаўскага раёну (а гэты раён на сплаве самы вялікі)—да гэтага часу яшчэ брэзэнт не атрыманы. Вось чаму некаторыя прарабы ўскладаюць усе надзеі на неба.

— Калі будзе дожд, калі спыняцца вятры—выплывем. Інакш ня ручаемся.

КАНКУРЭНЦЫЯ ЗАМЕСТ ВЫРАЗНАЙ РАБОТЫ

— Калі будзе дождж, калі спыняцца дык, здаецца, трэба было-б сьпяшацца. Трэба як мага хутчэй вывезьці лес з небясьпечных рэчак, але ўсе спробы паскарэньня сплаўных работ разьбіваюцца аб другое «вузкае» месца. Для сплаву не хапае рабочых. Непраўдападобна, але гэта факт. Адусюль—з акруг, раёнаў і шматлікіх рэчак чуецца крык:

— Дайце рабочых.

Лесбел і Наркампрацы хвалююцца і бездапаможна разводзяць рукамі. Дзесяткі вербаўшчыкоў мятусяцца па вёсках і частка варочаюцца ні з чым. Але ня думайце, што на вёсках няма плытагонаў. Яны ёсьць, але Наркампрацы іх, відаць, ня можа ўзяць. І калі гаварыць адкрыта, дык трэба прызнаць, што ільвіная доля віны за гэта прыпадае іменна на Наркампрацы і Лесбел. Пачнем на парадку.

Ганяючыся за рабочай сілай, раённыя аддзяленьні Лесбелу наладзілі паміж сабою агідную, неданушчальную канкурэнцыю. Клясычны прыклад паказала Полацкая акруга. Справа ў тым, што для сплаву ў Барысаўскім раёне неабходна вербаваць у Лепельскім раёне, Полацкае акрузі, 700 кваліфікаваных плытагонаў. Але ў Полацку таксама сядзяць не прастакі.

— Спачатку мы навярбуем сабе рабочых, а ўжо потым, пасьля нас, будуць вербаваць для Барысава.

Такім быў адказ Полацкае акругі.

Канкуруюць паміж сабою ня толькі раёны, але нават паасобныя вучасткі самі «памылкова» адзін вучастак пасылае вербаўшчыкоў на тэрыторыю другога вучастку. Такі выпадак здарыўся ў Плешчаніцкім вучастку, куды Гаінскі вучастак паслаў свайго дзесятніка Кагана шукаць рабочых.

ТАК ПРАЦАВАЦЬ НЕМАГЧЫМА

Яшчэ больш школы прыносіць сплаву **ілічная сьляпата і блізарукасьць** ...ўшыкоў і кіраўнікоў сплаву. У ...рабочай сілай яны не ганьб... ...ходзяцца ў іх рабоце

Наркампрацы ня здольны ўлічваць абстаноўку на мясцох. Таму нярэдка работа іх прыводзіць да адмоўных вынікаў. Нядаўна акруговы інспэктар па вярбоўцы рабочых ў Барысаўскім раёне тав. Ярош быў у Плешчаніцах. І тое, што ён там зрабіў, апісае прараб Плешчаніцкага вучастку.

— Калі т. Ярош ехаў назад, ён у некаторых вёсках Шчабскага сельсавету канчаткова ўскаляваў усіх плытагонаў. Ён ім нагаварыў, што будуць падрыхтаваны гатовыя лавы на Гайну, адкуль яны будуць сплаўлены да Барысава. Таму рабочыя чакаюць цяпер, каб ім прыслалі гатовыя лавы. А тут яны спадзяюцца ўзяць добрую цану, бо ім столькі глупства нагаварылі, што з імі цяпер немагчыма дагаварыцца.

— Адным словам—сумуе прараб—хто толькі не лянуецца, той і псуе справу. Пры такім становішчы зусім немагчыма працаваць.

У другім месцы, у сяле Адзяцічах, таго-ж Барысаўскага раёну, зрабіла яшчэ лепш. Вербаўшчык на сходзе запрапанаваў, каб вярбоўку праводзілі толькі праз калгасы. Апрача таго, ён дамагаўся таго, каб з заработку навербаваных рабочых—калгасьнікаў і некалгасьнікаў адлічалі 5 проц. у калгасы. Ці дзіва, што пры такім становішчы да гэтага часу ня ўдалося завербаваць амаль ні аднаго рабочага ў Адзяцічах, хаця тут жывуць амаль выключна плытагоны.

ПАТУРАЮЦЬ РВАЦТВУ

Шапёная канкурэнцыя і адсутнасьць палітычнага пачуцьця пітаральна дэзарганізавалі рынак працы. Рабочыя занялі пазыцыю чаканьня. Разважаюць яны вельмі проста:

— Мы патрэбны, нас шукаюць. Таму няхай нам плацяць столькі, колькі мы хочам.

Вось чаму ў цэлым радзе сёл і раёнаў разьвілося яўнае, нічым ня прыкрытае рвацтва. Сяляне-плытагоны выстаўляюць нябывалыя патрабаваньні. Адны патрабуюць павялічыць расцэнкі ў два разы, іншыя на 50 проц., на 25 і г. д. Горш за ўсё, што людзі адказныя за сплаў сям-там ужо пачынаюць хістацца. Яны гатовы ісьці на ўступкі і тым самым яшчэ больш дэзарганізаваць рынак працы. Асабліва ясна выявіў сваю мяккацелясьць прараб Плешчаніцкага вучастку. Спалохаўшыся, ня ведаючы як направіць справу, прараб тэлеграфуе: «Вада памяншаецца. Плытагонаў 25 проц. патрэбнае колькасьці. Можна навербаваць яшчэ 200 чалавек пры павялічэньні расцэнак мінучага году на 30--40 проц.».

Калі-б плешчаніцкі прараб быў выключэньнем, ня варта было-б гаварыць аб ім. Але бяда ў тым, што амаль усюды ёсьць тэндэнцыя павышэньня расцэнак супроць існуючых норм. У гэтым крыецца вялікая небясьпека. Рынак працы будзе яшчэ больш дэзарганізаваны, сабекошт драўніны будзе павышаны.

КАЛГАСЫ І ВЯРБОЎКА ПЛЫТАГОНАЎ

Слабы прыцёк рабочай сілы на сплаў тлумачыцца **адсутнасьцю яснасьці і выразнасьці ў рабоце калгасаў.** Як правіла, калгасы ня ведаюць свайго пляну, ня ведаюць свае патрэбы ў рабочай сіле, вельмі неахвотна адпускаюць рабочых на сплаў.

У вёсцы Вяляцічы 150 кваліфікаваных плытагонаў. Усе яны ўваходзяць у калгасы. Аднак, праўленьне калгасу не адпускае іх на работу.

— Вось калі складзем новыя пляны—гаворыць калгас—тады вазьмеце, а цяпер не дамо.

У Зэбельскім сельсавеце (вёска Любчы) старшыня калгасу гатоў пусьціць рабочых, аднак, ён адмаўляецца сам пасылаць.

— Калі я буду пасылаць рабочых—гаворыць ён—дык калгас можа разваліцца. Аўтарытэт праўленьня зьнізіцца (?).

У той-жа час некаторыя калгасы парашылі выкарыстаць становішча для ўмацаваньня сваіх калгасаў. Напрыклад, нядаўна старшыня аднаго калгасу зьявіўся ў Барысаўскую раённую кантору Лесбелу і запрапанаваў браць на работу толькі членаў калгасу. Паводле яго думкі, гэта будзе спрыяць хутчэйшаму росту калгасаў. Няма чаго і гаварыць пра...

...карэнная сацыялістычная перабудовы сельскае гаспадаркі. Веснавая кампанія бягучага году набывае рашучае значэньне ў выкананьні задачы судольнае калектывізацыі і далейшага рашучага наступленьня і выкарчоўваньня карэннянай капіталізму ў сельскай гаспадарцы і ліквідацыі кулацтва, як клясы. Таму пасеўную кампанію трэба ператварыць у «сапраўдную бальшавіцкую пасеўную кампанію», у кампанію грунтоўнай перабудовы старых вытворчых сіл сельскае гаспадаркі на сацыялістычнай падставе. Замацаваць дасягнутыя посьпехі і забясьпечыць далейшы шпаркі рост калгасаў і ўзьняць іх на больш высокую ступень.

Усё гэта патрабуе нябывала шырокай мабілізацыі рабочае клясы, перабудовы мэтадаў і форм кіраўніцтва з боку ўсіх зьвеньняў каапэрацыйных, савецкіх і партыйных органаў (кажа аўтар).

У гэтай кніжцы дана падрабязнае асьвятленьне асноўных галін калгаснага будаўніцтва ў БССР. Паказана яскрава на жывых прыкладах і таблiцах, што намечана зрабіць у адносінах пашырэньня асьпяне плошчы, павышэньня ўраджайнасьці, палепшаньня жывёлагадоўлі, машынаазабесьпячэньня калгасаў і г. д. Матар'ял, даны ў кніжцы, досыць карысны. Трэба набыць гэту кніжку кожнаму калгасу, кожнаму практычнаму работніку, які працуе ў вёсцы, кожнаму камуністаму і камсамольцу.

Сырцоў разьбірае плян сацыялістычнага будаўніцтва калгасаў і асабліва зварачае ўвагу на кіраўніцтва і ўзаемаадносіны паміж цэнтрам і мясцовымі калгасамі. Апрача таго закранае такія пытаньні, як-то: спэцыялізацыя калгасаў, стварэньне кадраў, вытворчая сувязь і інш. (Прамова зроблена на Ўсеукраінскай нарадзе буйных калгасаў з ліпеня 1929 г.).

Кніжка Лібэрман аб арганізацыі беднаты і батрацтва перакладзена і перапрацована паводле беларускіх матар'ялаў М. Кузьмою. Ахапляе паступлныя пытаньні: 1) Ленін і беднота, 2) 14 і 15 вясьдаў аб беднаце, 3) У чым прычыны слабае работы груп беднаты, 4) Работа груп беднаты і кіраўніцтва імі, 5) Групы беднаты і калгасы, 6) Аб памылках кіраўніцтва і чужых людаях, 7) Новыя дырэктывы Цэнтральнага Камітэту партыі. Кніжка **тав. Кузьмою** перапрацавана добра, матар'ял, які знаходзіўся ў аўтара, выкарыстаны дастаткова. Тав. **Кузьма** даў папулярную, зразумелую і проста складзеную, з жывым матар'ялам кніжку па арганізацыі беднаты і батрацтва. Заслугоўвае распаўсюджваньня.

Тав. Якаўлеў у брашуры «За арганізацыю сапраўды калектыўнае вытворчасьці» выяўляе чарговыя задачы надыходзячай пасеўнай кампаніі, задачы арганізацыі вытворчасьці, арганізацыі працы, будаўніцтва, статуту і інш. Брашура можа служыць асноўным дапаможнікам кожнага дакладчыка па падрыхтоўцы дакладу аб весьнавой сяўбе.

Тав. Казакоў у сваёй кніжцы спыняецца на пытаньні кіраўніцтва, арганізацыі і аплаты працы. Пры распрацоўцы пастаўленых пытаньняў, аўтар скарыстаў практыку арганізацыі ў калгасаў і выходзіў з тых меркаваньняў, што калгасы ў бліжэйшым будучым павінны нератварыцца ў індустрыялізаваныя фабрыкі с.-г. прадуктаў і сыравіны, арганізацыя працы ў якіх будзе ўсё больш набліжацца да саўгасаў. На ўзорах арганізацыі працы дзяржаўнае фабрыкі трэба вучыцца і калгасам. Пытаньні кіраўніцтва, арганізацыі і аплаты працы, ня гледзячы на іх вялізарную важнасьць для калгаснага будаўніцтва, слаба асьвятляюцца ў калгаснай літаратуры. Аўтар з усклядзенымі на яго задачамі справіўся. Гэта кніжка дапаможна практычным работнікам, арганізатарам калгасаў, калгасным агранонам, знайсьці правільныя шляхі ў вырашэньні пытаньняў арганізацыі і кіраўніцтва працы.

Т. Гладкоў апісвае украінскую камуну «Авангард» лёгкім і сучасным стылем. Чытаецца кніжка з захапленьнем. Аўтар у сваёй кніжцы кораткa, але яскрава паказаў, як камуна «Авангард» вырасла на кулацкіх развалінах у маштуную сацыялістычную гаспадарку. Досыць удала ахапляе галоўныя бакі жыцьця: зямляроботва, жывёлагадоўлю і культурны быт.

Я. Чалядзінскі ў сваёй кніжцы «Барацьба за калгасы» досыць мастацка апісаў першы раён суцэльнае калектывізацыі Клімавічы. Спыняючыся, ў большасьці на арганізацыйных момантах паасобных калгасаў, як «Камінтэрн», «Камунар Магілеўшчыны», «Ленінскі Шлях» і іншых, аўтар даў каштоўныя нарысы з жыцьця калгаснікаў. Матар'ял узяты з газэт для яскравай і наглядной ілюстрацыі, выкарыстаны вельмі ўдала. Аўтар, будучы сам удзельнікам у кампаніі па калектывізацыі Клімавіцкага раёну, выкарыстаў жыцьцёвы матар'ял, апісаўшы яго проста і зразумела, прыстасаваўшы для сялянскае бібліятэкі.

Кніжка **«Вольны час у калгасе»** правільна выкладае асноўныя палажэньні найлепшага выкарыстоўваньня вольнага часу ва ўсіх'ях сельска - гаспадарчых калектывах.

Аўтары брашуры жыцьцёва паказваюць, як найлепш выкарыстаць вольны час пераходзячы ад калектыву з нізкай ступенью абагуленьня, з малым культурным узроўнем да камуны с сапраўдным культурным адпачынкам. Гэта брашура зьявілася вынікам испаседнай працы студэнтаў у розных калгасах СССР. Кніжкі **«Чаму ў аднэй камуне лепш, а ў другой горш»** і **«Мужыцкае шчасьце»** у асноўным адлюстроўваюць адны і тыя-ж пытаньні. Кожная з іх паасобку правільна паварае пытаньне калгаснага будаўніцтва, палепшэньня ўраджайнасьці і г. д.

Брашура **«Задачы, зьмест і формы антырэлігійнай працы ў калгасах»** зьяўляецца навінкаю. Цалкам адпавядае сучаснасьці, здавальняюча ахоплены ўсе галоўныя бакі антырэлігійнай працы ў калгасах. Брашура досыць карысная, заслугоўвае хутчэйшага распаўсюджаньня.

Брашура Зубрыніна разьлічана на малапісьменнага чытача. Аўтар зьвярнуў увагу на значэньне сяваркі з агранамічнага боку, але слаба адлюстраваў яе значэньне ў буйным і дробным калгасе.

Апрача рэцэнзуемых падаю ніжэй рад брашур, выданых БДВ і Дзяржвыдавецтвам РСФСР, якія раю набыць кожнаму аграному - калгасьніку, настаўніку і грамадзкаму вясковаму працаўніку. Як-напрыклад: «Што трэба ведаць аб дасьпі кароў»—**Масьленікаў,** «Карысьці ад правільнага кармленьня і догляду малочнай жывёлы» — праф **Ліскун;** «Як атрымаць добры ўраджай ільну» — **Вінаградаў;** «Мінэральныя ўгнаеньні і як імі карыстацца» — агр. **Палонін;** «Веснавая сельска - гаспадарчая кампанія і палітпрасьвет установы» — **Левінсон і Сьмірноў.**

Я. К. ЖЫДОВІЧ.

Перавыбары заўкомаў мэталістых

На „Чырвоным Мэталісьце"---падрыхтоўка слабая

Да 15 красавіка перавыбары будуць скончаны

Перавыбары заўкомаў саюзу мэталістых падыходзяць да канца. На 8-ае красавіка амаль што на ўсіх прадпрыемствах, за выключэньнем двух—заводу «Энэргіі» і «Чырвоны Мэталісты» —перавыбары скончаны. На «Энэргіі» і «Чырвоным Мэталісьце» скончаны перавыбары цэхпрафбюро.

У прыватнасьці, на заводзе «Чырвоны Мэталісты» падрыхтоўка праходзіць ня зусім здавальняюча. У праверцы работы заўкому прымае ўдзел усяго каля 60 чал. з агульнага ліку 1.000 рабочых. Між тым, мы ведаем выпадкі, калі ў праверцы работы фабзаўкомаў прымала ўдзел каля трэці рабочых прадпрыемства (фабрыка «Чырвоная Зорка», Чашнікі, Віцебскай акругі). Асабліва слаба праведзена падрыхтоўчая работа ў мэханічным цэху. Рабочыя, занятыя вучобай (70 чал. з 190), амаль ня прынялі ўдзелу ў падрыхтоўцы да перавыбараў заўкому. У гэтым-жа цэху прышлося распусьціць прафбюро за заціск самакрытыкі.

У многіх выпадках адказнасьць за дрэнную падрыхтоўку да перавыбараў трэба ўскласьці на вылучаных прафработнікаў, якія прымаюўваліся да прадпрыемстваў і амаль ніякіх ня рабілі.

Зусім слаба былі прыстасаваны да перавыбараў клюбы і чырвоныя куткі. Культурна-масавая работа праведзена вельмі мала.

Перавыбары заўкомаў саюзу мэталістых будуць скончаны да 15-га красавіка.

Н—аў.

Адменены перавыбары заўкому заводу „Інтэрнацыянал"

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Прэзыдыум Гомельскага акрпрафбюро адмяніў перавыбары заўкому цьвікавога заводу «Інтэрнацыянал» у Рэчыцы, на якім працуе звыш 300 рабочых.

На перавыбарчым сходзе прымала ўдзел ўсяго 75 проц. рабочых, ня ўсе кандыдатуры былі прагаласаваны, два члены заўкому атрымалі **менш 50 проц. галасоў прысутных.**

Прэзыдыум акрпрафбюро таксама паставіў на від фабкому суседняй запалкавай фабрыкі **«Дняпро»** невыканаўнае дырэктывы аб дапамозе заўкому заводу «Інтэрнацыянал».

Усебеларуская транспартная картарада

Нарада заслухала даклады т.т. СПУЛКІНА і НАВУМАВА аб дзейнасьці праўленьняў МББ і Заходняй чыгунак.

Дакладчыкі адзначылі, што першы квартал чыгункі скончаны з вялікім прарывам. Плянавыя заданьні ня былі поўнасьцю выкананы. У другім квартале ў рабоце транспарту наступіў пэўны пералом. Але на гэтым нельга ні ў якім разе супакоіцца. На чыгунках яшчэ маюць месца буйныя прарывы і непарадкі. Сацыялістычнае спаборніцтва, ударны рух, вытворчая дысцыпліна на транспарце яшчэ не знаходзяцца на належнай вышыні.

Праўленьні дарог з мэтай ліквідаваць непарадкі і наладзіць транспарт прыступілі да рэарганізацыі работы. Да 1-га мая рэарганізацыя транспарту павінна быць скончана. Поўнае правядзеньне рэарганізацыі дасьць вялікі эканамічны эфэкт і забясьпечыць добрую работу транспарту.

**Па дакладах т. т. СПУЛКІНА і НАВУМАВА выказал

Фрунзаўская рабочая канфэрэнцыя

Работу МЦРК—пад масавы кантроль

Спрэчкі аб рабочым назваць ар... шырокай пэрэбкопу.

Сярод дэ... шоў, якія... абсьледван... На канфэр... ніках гэтага...

— Мы... якасьць пр... ны дзень... хлебе, аб... ных пра... у каўбасе, гэтага часу... та, каб лі... зьявіўчы... па канкрэ... лічыцца з... пайшчыка... у апараце...

— Асобны... вельмі ня... абавязкоў... мах, груба... Апарат М... элемэнтам, ... чачысьціць... дзей, бо і... ках. (Тав.

Шмат п... хопы грам... нялі вялі... шасьці ста... кас вялікі... ца цэлымі... месца за... най якасьц... ніку знахо... інш. «канф...

МЦРК н... манца над... харчаваньн...

Старшы... у сваёй п... хопаў, п... цыі. Тав. Ка... працы МЦ... дахопаў, ... мадзкага... выкліканы... шпаркім... магазынаў, ... прыклад, ... толькі 100... дастрчніка... было 7, а... павеличаць... і апарат М... 1928 годзе.

Зараз М... фабрыкі - ... 24.000 абс... што з... дахопы ... дуць ліквід... і пайшчы... ...ацыі, у звязі з апошнімі пастановамі ЦК УсеКП(б).

— Зараз рабочая сувязь з вёскай павінна быць сканцэнтравана вакол канкрэтнай дапамогі правядзеньню веснавой сяўбы. Усю энэргію, усю сілу трэба мабілізаваць, каб выкапаць плянты папшрэньня пасеўнай плошчы, каб уникнуць небясьпекі няпоўнага засеву палёў сацыялістычнага і індывідуальнага сэктару сельскае гаспадаркі.

Трэба в усёй сілай ударыць па тых, хто дасюль ня хоча выправіць дапушчаныя перагібы, хто ўпарта чапляецца за свае памылкі, хто акрамя адміністраваньня не знаходзіць іншых мэтадаў работы на вёсцы.

Тав. Васілевіч падкрасьліў неабходнасьць рашучай барацьбы з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, і «левымі» загібамі, якія стваракуць глебу для праваапартуністкай дзейнасьці.

Закрануўшы пытаньне аб прамфінплане, тав. Васілевіч адзначыў, што нарастаючая небясьпека вайны асабліва патрабуе поўнага вывучаньня прамфінплану, бо ад гэтага залежыць узмацненьне абароназдольнасьці краю. Пытаньне прамфінпляну зьяўляецца ня толькі папым унутраным, але міжнародным пытаньнем. Аб гэтым выразна сьведчыць ліст беластоцкіх рабочых да рабочых БССР.

У заключэньне т. **Васілевіч** ахарактарызаваў задачы ў галіне чысткі апарату.

Вялізарныя задачы, якія стаяць перад рабочай класай, вымагаюць ачысткі апарату ад усіх тых, хто ня здольны праводзіць лінію партыі. Мы можам вырашыць складаныя задачы, якія стаяць перад намі, толькі маючы такі падабраны апарат, які-б ня хістаўся, не вдаваў-бы сваіх пазыцый, не адставаў-бы ад тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі.

Канфэрэнцыя заслухала заключнае слова т. Гольдэрга і прыняла рэзалюцыю па дакладах.

Пажарная ахова Менску—далёка не на вышыні

Трэба пабудаваць новае пажарнае дэпо

Шырока разгорнуты тэмп будаўніцтва ставіць перад намі вельмі важную задачу—гэта паляпшэньне пастаноўкі пажарнай аховы нашых прадпрыемстваў.

Трэба адзначыць, што пажарная ахова пастаўлена ў нас вельмі дрэнна. **Яшчэ не на ўсіх прадпрыемствах арганізаваны добраахвотныя пажарныя каманды. Там, дзе яны і існуюць, пажарныя каманды работы свае не наладжэлі.** Пажарнікі да начных дзяжурстваў адносяцца нядбайна. Яны часта не зьяўляюцца на дзяжурствы, а часам і сьпяць на пасту.

Ня лепш адносіцца да пажарнае аховы і фабрычна-заводзкая адміністрацыя. **Яна ня выконвае прапаноў аддзелу па пажарнай ахове і не набывае патрэбнага пажарнага інвэнтару.** Многія кіраўнікі нашых прадпрыемстваў стараюцца «эканоміць» на тых ці іншых супрацьпажарных мерапрыемствах. Пабудова дэпо для пажарных машын пастаўлена таксама вельмі кепска. З прычыны нядбайнасьці да аховы нашых будынкаў мы маем сотні тысяч руб. страт ад пажару. Аб гэтым выразна сьведчыць прыклад з нядаўна згарэўшым у Менску домам вансведу.

Работа пажарных каманд г. Менску не адпавядае запатрабаваньням у пажарнай ахове. Гарадзкая пажарная каманда размешчана ў вельмі навыгадным месцы для шпаркіх выездаў. Вуліца Бакуніна, дзе знаходзіцца пажарнае дэпо, вельмі вузкая. Добраахвотная гарадзкая пажарная каманда мае ўсяго толькі дзьве бочкі вады. На ўвесь Менск ёсьць толькі адны мэханічныя, рассорваючыя пажарныя драбіны і то толькі на тры паверхі, у той час як дамы, якія мы зараз будуем, маюць па 5-6 паверхаў.

Яшчэ ў 1927 годзе аддзел пажарнай аховы ўзьняў перад Менскім гарсаветам пытаньне аб пабудове ў Менску Цэнтральнага пажарнага дэпо, паводле апошняга слова тэхнікі. Між тым, да гэтага часу гэта пытаньне практычна ня вырашана.

Уьесь раён МБВ чыг., дзе зьмяшчаюцца завод «Пралетары», база Белкаапсаюзу, склады Гандальбуду, фармазавод і іншыя прадпрыемствы абслугоўваецца толькі адной пажарнай камандай МБВ чыгункі, якая ні ў якім разе ня можа справіцца са сваёй работай, бо яна ня мае нават патрэбнай цягавай сілы.

Адпаведныя арганізацыі павінны арабіць належныя захады і ў самым тэрміновым парадку прыступіць да паляпшэньня пажарнае аховы ў Менску.

А. МІРОНАЎ.

Беларуская с.-г. акадэмія на дапамогу пасеўнай кампаніі

У зьвязку з веснавой пасеўнай кампаніяй, у Беларускай с.-г. Акадэміі адбыліся датэрміновыя выпускі апошніх курсаў факультэтаў, якія далі 310 спэцыялістых па розных галінах сельскай гаспадаркі. Апрача таго, мабілізавана для правядзеньня пасеўнай кампаніі 510 студэнтаў 3-га курсу факультэтаў с.-г. Акадэміі і с.-г. тэхнікумаў Беларусі.

Студэнтамі і навуковымі працаўнікамі акадэміі сабрана 1.500 руб. на арганізацыю трактарнай калёны.

Да антывялікоднай кампаніі

ТЭЗІСЫ ДЛЯ ДАКЛАДЧЫКАЎ

(Канец)

10. Пра... дзячы антырэлігійную работу, трэба ... ёсьці барацьбу са скажэньнямі ў гэтай ... працы. У апублікаванай 15 сакавіка ... г. пастанове ЦК УсеКП(б) ... ца весьці жорсткую барацьбу ... з практыкай заціньненьня будынкаў рэлігійнага культу ў адміністрацыйным парадку; ... ецца дапускаць зачыненьне будынкаў рэлігійнага культу толькі ў выпадку сапраўднага жаданьня большасьці сялян і ня інакш, як з зацьверджаньня пастаноў сходаў абласнымі выканкомамі або ЦВК рэспублік. Але побач з гэтым неабходна змагацца з ліквідатарскімі настроямі ў адносінах да рэлігіі, ... ай прапаганды і недаацэнкай важнасьці барацьбы з рэлігіяй. Небясьпека гэтай недаацэнкі ў нас наглядзецца.

11. Антывялікодная кампанія сярод палякаў і беларусаў-каталікоў праводзіцца ў гэтым годзе ў абставінах, калі рымскі папа, правадыр каталіцкай царквы, зьвярнуўся з адозвай да ўсіх буржуазных краін аб неабходнасьці «крыжовага паходу» супроць СССР.

У гэтай адозве папа займаецца хлусьнёю аб тым, што быццам у СССР прыгнечваецца рэлігія і наогул усё верующыя людзі; акрамя таго папа піша, што «служачы ўстаноў мужчыны і жанчыны прымушаюць падпісваць фармальныя заявы аб адступніцтве ад рэлігіі з хулой на бога, пад пагрозай пазбаўленьня картак на хлеб, адзеньня і інш.» Усім вядома, што гэта зьяўляецца наглай хлусьнёй папы.

Разам з папам злучылася расійская белагвардзейшчына, былыя князі, архіерэі, капіталісты, Керанскі і Мілюкоў. Разам з ім выступаюць яўрэйскія рабіны Амэрыкі, Ангельшчыны і Польшчы, архіепіскап Кэнтэрбэрыйскі—глава ангельскай царквы і рэлігійныя кіраўнікі ўсіх іншых рэлігій. Усе яны нахрабуюць разам з папай, каб капіталістыя абвясьцілі крыжовы паход на бальшавікоў, гэта значыць вайну супроць СССР. Гэта наглае выступленьне буржуазнага сьвету на чале з намесьнікам бога--папай і папамі ўсіх рэлігій зьяўляецца падрыхтоўкай адзінага фронту супроць СССР.

12. Антывялікодная кампанія сярод яўрэяў павінна быць цесна ўвязана з клясавай сутнасьцю яўрэйскага вялікадня, з высьвятленьнем шавіністычнай ідэі, закладзенай у біблейскае апавяданьне аб паходжаньні яўрэйскага вялікадня.

Неабходна завастрыць увагу працоўных яўрэяў на наступных момантах: яўрэйскі вялікдзень навучае працоўных накорнасьці богу і гэта адцягвае іх ад актыўнай барацьбы і ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Яўрэйскі вялікдзень зацямняе клясавую сьвядомасьць, бо ён вучыць, што усе яўрэі браты. Яўрэйскі вялікдзень шкодзіць працоўным яднацца з працоўнымі другіх нацыянальнасьцяй.

13. Сьвята вялікадня зьяўляецца сьвятам п'янства і хуліганства. Неабходна завастрыць увагу працоўных на барацьбе за новы бязбожны быт і на адмаўленьне ад рэлігійных сьвят. Антывялікодная кампанія павінна зьвяліцца штурмам наглыбленай і пашыранай антырэлігійнай працы, у асабліваści сярод жанчын, да пазбаўленьня іх ад бытавога закабаленьня рэлігіяй. Факты нашай беларускай сучаснасьці паказваюць, што часта арганізацыя калектываў затрымліваецца з-за рэлігійнасьці жанчын. Неабходна таксама разгарнуць бязбожную работу сярод дзяцей, арганізаваўшы іх у групы юных бязбожнікаў. Кіраўніцтва гэтай работай павінны ўзяць на сябе ячэйкі СВВ пры школах і настаўніцкія калектывы.

Выканбюро ЦС СВБ БССР.

МЕНСК

У Менску пачнецца пабудова геафізычнай абсэрваторыі

У 1930-31 годзе ў Менску будзе пабудавана геафізычная абсэрваторыя, якая будзе праводзіць дасьледчую работу па гідрамэтэаралёгіі. Трэба адзначыць, што да гэтага часу розныя камісарыяты мелі ўласныя сеткі мэтэаралёгічных станцый і гідралёгічныя пасты, якія часта выконвалі адну і тую-ж работу. Зараз усе гэтыя мэтэаралёгічныя станцыі і гідралёгічныя пасты пераходзяць пад загад гідрамэтэаралёгічных камітэтаў, якія існуюць пры СНК нашых савецкіх рэспублік.

Па сваёй працы геафізычныя абсэрваторыі ня будуць абмяжоўвацца толькі аднымі тэарытычнымі пытаньнямі. Яны будуць займацца і практычнымі пытаньнямі.

У зьвязку з гэтым беларуская геафізычная абсэрваторыя будзе мець вельмі важнае практычнае значэньне для разьвіцьця нашай сельскай гаспадаркі. Абсэрваторыя зможа шмат чым дапамагчы нашым плянавым органам. Яна дапаможа падвесьці навуковую базу (кліматычную) пад плянавую работу ў сельскай гаспадарцы. Абсэрваторыя дапаможа выкарыстаць у практычных мэтах курортна-кліматычныя асаблівасьці пасобных раёнаў рэспублікі.

Г. МАСЛАКАВЕЦ.

Узмацніць падрыхтоўку да выстаўкі

Прэзыдыум ЦВК БССР прызнаў, што як цэнтральныя, так і нізавыя савецкія арганізацыі дрэнна рыхтуюцца да ўсебеларускай с.-г. выстаўкі. Прэзыдыум запрапанаваў усім цэнтральным установам зараз-жа вылучыць прадстаўнікоў, адказных за падрыхтоўку экспанатаў. Усім акрыканкомам запрапанавана ажыьіць дзейнасьць акруговых і раённых выстаўкомаў, арганізаваць спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да выстаўкі, разгарнуць кампанію па папулярызацыі выстаўкі. Галоўвыстаўкому даручана арганізаваць у галоўным павільёне аддзел яўрэйскага зямляроблства.

Пастанова ўраду аб вылучэнцах

Прэзыдыум ЦВК БССР зацьвердзіў праект пастановы аб вылучэнцах. Гэтай пастановай вызначаны пэўны парадак вылучэньня рабочых і сялян на адказную работу, а таксама прадугледжаны мерапрыемствы па стварэньні спрыяючых умоў для работы вылучэнцаў.

Вылучэньне праводзіцца агульнымі сходамі рабочых, прафэсыянальнымі і грамадзкімі арганізацыямі, мясцовымі выканкомамі і саветамі, сэкцыямі і камісіямі саветаў і агульнымі сходамі калгасьнікаў. За вылучэнцамі захоўваюцца ўсе правы і льготы, якімі яны карысталіся да вылучэньня. Пры скарачэньні штатаў яны звальняюцца ў апошнюю чаргу.

500 тысяч руб. на пабудову дому камуны „Асьветнік-Камунар"

СНК БССР пастанавіў асигнаваць будаўнічаму каапэратыву «Асьветнік Камунар» 500 тысяч рублёў на пабудову ў Менску дому-камуны для навуковых працаўнікоў. Белкамунбанку прапанавана ў гэтым годзе адпусьціць у лік гэтай сумы 100 тысяч рублёў.

20 тысяч рублёў на абслугоўваньне сплаўшчыкаў

Саюз с.-г. рабочых адпусьціў 20 тысяч рублёў на культурнае абслугоўваньне сплаўшчыкаў. У некаторых сплаўных раёнах арганізуюцца культ-лодкі і г. д.

Ясьлі ў калгасах і саўгасах

У Менскай акруговай інспэкцыі аховы здароўя пачаліся падрыхтоўка да летняй ясельнай кампаніі. Па калгасах і саўгасах акругі будзе адкрыта 250 ясель. Па раёнах і ў Менску адкрыты спэцыяльныя курсы для падрыхтоўкі з калгасьніц і сельска - гаспадарчых работніц ясельных работнікаў.

Гэрої працы

Прэзыдыум ЦВК БССР надаў годнасьць гэрояў працы т. т. **Камянецкаму і Хімакову.**

Тав. **Камянецкі** 40 год працуе на прадпрыемствах, зьяўляецца рабочым-актывістым, арганізатарам ударных брыгад. У часе белапольскай акупацыі ён выратаваў завод «Камінтэрн» ад падпалу.

Тав. **Хімакоў** 33 гады працуе на вытворчасьці, атрымаў узнагароду за перавышэньне норм выпрацоўкі. У часе грамадзянскай вайны арганізоўваў партызанскія атрады.

Брыгады ІТР па праверцы прамфінплянаў

Прэзыдыум Беларускага бюро інжынэрна - тэхнічных работнікаў зьвярнуўся да ўсіх спэцыялістых з адозвай прыняць актыўны ўдзел у праверцы выкананьня прамфінпляну і давядзеньне яго да цэху і рабочага.

Ужо вылучаны брыгады інжынэрна-тэхнічных работнікаў на прадпрыемствах «Энэргія», «Камунар», «Пралетары», «Бальшавік», і абутковай фабрыцы.

У Гарсавеце

— 10-га красавіка склікаецца пленум Гарсавету, на якім будзе заслуханы даклад аб рабоце МЦРК і рабочым вабесьпячэньні.

— Прэзыдыум Гарсавету адпусьціў каля 6.000 руб. на палітасьветную работу і на адкрыцьцё дзіцячых ясьлей у калгасах падшэфнага Заслаўскага раёну.

За дзень

— Нам. старшыні ВСФК БССР тав. **Лёў** абраны на пленуме ВСФК СССР членам прэзыдыуму Вышэйшага савету фізкультуры пры ЦВК СССР.

— 5-га мая ва ўсіх акругах Беларусі адкрываюцца месячныя курсы фізкультурнікаў. Курсы падрыхтуюць 400 інструктароў для гарадзкіх, калгасных і саўгасных фізкультурных гурткоў.

— Нацкамісія Мен. АВК абсьледавала **бытавыя ўмовы жыцьця асырыйцаў** (нерсаў), якія зараз пражываюць у Менску. Камісія высьветліла, што асырыйцы жывуць у вельмі дрэнных умовах. АВК запрапанаваў Біржы працы ўзяць ўсіх асырыйцаў на вучот для пасылкі іх на сталую работу. МЦРК — запрапанавана выдаць ім заборныя кніжкі.

— Пазаўчора ў клюбе «Дрэваапрацоўшчыкаў» адбыўся **урачысты вечар рабочых-вылучэнцаў саюзу дрэваапрацоўшчыкаў сумесна з гаспадарнікамі.** Паводле вестак ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў на ўсіх прадпрыемствах саюзу налічваецца 70 рабочых-вылучэнцаў.

— 12-га красавіка на **прэзыдыуме ЦК саюзу працаўсьветы СССР** будзе заслуханы даклад НКА БССР і судаклад ЦП саюзу Працасьветы аб практычных мерапрыемствах па падрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў для ўсеагульнага навучаньня.

З лістоў рабселькораў

Злачынца знайшоў прытулак у МЦРК

У арцелі № 8 (**Менск**) працаваў нейкі **Шварц Абрам.** У мінулым за Шварцам мелася шмат злачынных учынкаў. Так, Шварц купляў аблігацыі ніжэй курсу. Працуючы ў арцелі № 8, на сваё месца наймаў рабочых, займаўся перапродажам жыта.

У Смалавічах Шварц меў сваю ўласную хлебапякарню, трымаў рабочых. Калі да Шварца прышлі прафпрацаўнікі па пытаньні аб нарманьні рабочага дня, то ён выгнаў іх вон. Мелі месца і такія выпадкі, калі Шварц працаваў на хлебапякарні і ў той-жа самы час атрымліваў са страхкасы пэнсію.

А такіх злачынных фактаў за Шварцам было шмат.

За ўсё гэта Шварц быў зьняты з работы ў арцелі, але нейкім чынам Шварц і зараз працуе ў МЦРК у якасьці загатчыка хлебнай крамы. Камісія па чысткі павінна зацікавіцца гэтым.

Д.

„За доўгі язык"

Добрасумленна і акуратна выконвала свае абавязкі тав. **Ліновіч** у бакалейна-гастранамічным магазыне пры Мазырскай дзіцячай камісіі. Яна працавала сем месяцаў у якасьці прыкажчыцы, а на восьмым месяцы работы прымушана была пакінуць яе з-за дрэннага здароўя. Пасьля выздараўленьня 29-XII 29 г. біржа паслала Ліновіч на работу ў той-жа самы магазын, дзе яна працавала 7 месяцаў і дзе яе атэставалі, як добрасумленную і акуратную работніцу.

І тут пачынаюцца згрызоты, пачынаецца цыганіна: загатчык магазыну тав. Фрыдман адпраўляе Ліновіч і піша на патрабаваньні біржы працы: «Нам патрэбен хлапец, а не дзяўчына»... Я ня люблю мець справу з бабамі, яны стваракуць плёткі, ну іх, давайце хлапца, а Ліновіч — у яе «доўгі язык і яна не патрэбна нам».

16 лютага зноў патрэбен быў работнік у гэты магазын, і біржа працы зноў накіроўвае беспрацоўную Ліновіч.

Высоўваецца новы матыў адмаўленьня: «У магазыне ёсьць тры работнікі і адзін вучань, усе яўрэі, нам патрэбен беларус, а таму Ліновіч нам не падыходзіць».

Калі яна зьявілася ў акрадзяненьне саюзу савецкіх і гандлёвых служачых, дык там ёй адказалі: «У магазыне жорстка праводзіцца адзіначальле, мы ня можам уменшацца ў іх справы... Едзеце ў РСІ».

Зноў сакавіка біржа працы не згадваецца з матывам, што там патрэбен беларус і катэгарычна прапануе прыняць на работу тав. Ліновіч, але загатчык магазыну, баючыся «доўгага языка» Ліновіч, адказвае біржы: «Мы наогул перадумалі, нам ужо нікога непатрэбна, мы абыйдземся з ранейшым складам работнікаў».

Справа пераходзіць у РСІ. Там «абураюцца» гэтай справай і даручаюць расьсьледаваць...

Расьсьледваньне яшчэ не пачалося. Ліновіч галадае і сядзіць без работы, а загатчык Фрыдман на пускае да сябе работнікаў з «доўгімі языкамі». Слова за РСІ.

САША ПЧОЛКІН.

Трактары чырвонаармейскім калгасам

СНК БССР абавязаў Наркамзем і Белкалгасцэнтр поўнасьцю забясьпечыць існуючыя чырвонаармейскія калгасы с.-г. машынамі, прыладамі, насеньнем і ўгнаеньнем. На працягу бягучага сэзону для чырвонаармейскіх калгасаў Полаччыны будзе вылучана 5 трактароў.

СНК згадзіўся з прапановай Наркамзему і Белкалгасцэнтру аб тым, каб машынатрактарная калёна саўгасу імя Дзэрсіцігодзэя БССР апрацавала зямлю камуны імя БВА.

Бабруйскаму і Полацкаму АВК прапанавана не пазьней 15 красавіка вылучыць патрэбную колькасьць агрэгатаў для работы ў чырвонаармейскіх калгасах.

На гэты год для чырвонаармейскіх калгасаў будзе адпушчаны доўгатэрміновы крэдыт у 150 тысяч рублёў.

Ільготы для калгасаў

СНК БССР абавязаў усе наркаматы, цэнтральныя ўстановы і арганізацыі, акрвыканкомы і райвыканкомы тэрмінова правесьці ў жыцьцё ільготы для калгасаў і іх членаў, вызначаныя пастановай ЦВК і СНК СССР.

Адначасова ўсім савецкім арганізацыям прапанавана прыняць усе меры да шырокай папулярызацыі і растлумачэньня ільгот калгасам.

Вечар „парванай галёшы"

8-га красавіка ў клюбе друкароў адбыўся першы вечар «парванай галёшы», прысьвечаны збору утыль-сыравіны.

Уваход на вечар мелі права толькі тыя, хто прынёс ня менш двух кілё утылю. За тыдзень да вечара на прадпрыемствах саюзу друкароў была праведзена растлумачальная работа: чыталіся лекцыі і даклады аб утылі. У выніку — вечар даў каля 4.000 кілё ўтылю. Заля клюбу не магла зьмясьціць усіх тых, хто жадаў прыйсьці на вечар.

Прадстаўнік Белдзяржгандлю зрабіў даклад аб значэньні збору утыль-сырцу. Была праведзена лётарэя і раздана літаратура аб утылі. Вечар вельмі зацікавіў усіх прысутных.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 7 гадз. (пакой № 21) **індывідуальная кансультацыя па пытаньнях калектывізацыі і пасеўкампаніі.**

У 7 гадз. увечары адбудзецца даклад тав. ТАМАШЭЎСКАГА для партыйнага і камсамольскага актыву на тэму: «БЛІЖЭЙШЫЯ ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ Ў ГАЛІНЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ». Пасьля дакладу мастацкая частка. Білеты па ячэйках і ў чытальні Дому.

Мен. АК МОПР. У 19 гадз. пасяджэньне прэзыдыуму АК. Яўка членаў і кандыдатаў АК абавязкова.

Клюб саўгандальслужачых. У 19 гадз. сход клюбнага актыву. На парадку дня даклад кіраўніка культбрыгады аб пастанове мастацкага савету.

Клюб навуковых працаўнікоў. У 6 гадз. пасяджэньне асьпірантскага бюро.

БДУ. У акт залі Пэдфаку у 7 гадз. агульны сход ваяўнічых бязбожнікаў пры МК БДУ.

Белдзяржбібліятэка. У 8 гадз. сход камсамольцаў палітасьветнай цэхавай ячэйкі.

Інстытут пэдагогікі і падзелёгіі. (Прыродазнаўчы корпус БДУ) У 8 гадз. адбудзецца пасяджэньне пэдагагічнай секцыі пэдолёга-пэдагагічнай асацыяцыі. Даклад тав. **Панкевіча** «Антырэлігійнае выхаваньне ў школе».

ЗАЎТРА

Пэдгабінэт. У 7 гадз. заключная лекцыя інжынэра **Цімашова** для выкладчыкаў фізыкі на тэму «Аўтатрактарныя рухавікі». Лекцыя адбудзецца ў памяшканьні школы шафэроў. (Доўгабродзкая вул.).

Клюб саўгандальслужачых. Антырэлігійны вечар. Даклад аб яўрэйскім вялікадні; выступленьне харавога гуртка; кіно — «Патомак Чынгіс-хана». Уваходна разасланых білетах. Пач. а 8 гадз.

Культпроп Фрунзаўскага райкому КП(б)Б паведамляе, што для распрацоўкі пастаноў сакавіковага пленуму ЦК КП(б)Б вызначаюцца ў адзінай партшколе тры дадатковых заняткі—11, 21 і 27 красавіка. Гэтыя дні трэба забраніраваць за партвучобай і ніякіх сходаў і масавых нарад не праводзіць.

Папраўка

У надрукаваным № 83 газэты «Зьвязда» (ад 9 красавіка) у артыкуле т. Курціка «Друк у барацьбе за багучыя задачы партыі» ўкраліся наступныя карэктурныя памылкі:

У першай калёнцы падзагалавак трэба чытаць:

«Перайсьці на вышэйшую ступень бальшавіцкай барацьбы за прамфінплян».

З другога радку другой калёнкі выпалі два словы, якія скажаюць сэнс. Трэба чытаць: «...але нясе адказнасьць разам з усім «трахкутнікам» і за тое, паколькі мабілізавана пралетарская грамадзкасьць наваколі справы выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну».

У шостым радку другой калёнкі зьлізу трэба чытаць замест «кіруючы зьвеньнуў»—«кіруючы зьвеньні».

У трэцяй калёнцы, чацьверты радок зьверху, трэба чытаць: «У газэтах замоўчваюцца пытаньні тэхнікі, разумовчы над гэтым ня тэхнічную базу вытворчасьці яе рэканструкцыю» і г. д.

У трэцяй калёнцы, чацьверты радок чытаць: «...сувязі з пасеўнай кампаніяй уменьне выбіраць...»

У чацьвертай калёнцы, у дасятым радку зьлізу, замест слова «сакратароў» трэба чытаць «сэкратараў».

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

У суботу, 12 красавіка, а 6 з пап. гадз. увеч. у вялікай залі Дому Камасьветы імя Карла Маркса адбудзецца

1-я ўсебеларуская нарада рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражак,

разам з агульна-гарадзкім сходам рабкораў, работнікамі друку, інжынэрна-тэхнічнымі сіламі і гаспадарнікамі.

Парадак дня: 1. Выкананьне прамфінпляну (дакл. т. Савкабойнікаў); 2. Даклад—нізавы друк у барацьбе за прамфінплян (дакл. т. Курціц); 3. Даклад аб перабудове масавай партыйнай і прафсаюзнай работы на прадпрыемстве і ў цэху (дакл. т. т. Кімковіч і Гаруновіч); 4. Інфармацыя аб праграме курсаў для рэдактароў шматтыражак (дакл. т. Ліпніцкі).

На нараду выклікаюцца рэдактары фабрычна-заводзкіх шматтыражак і загатчыкі масавымі аддзеламі ўсіх акруговых газэт Беларусі. У рабоце нарады прымуць удзел представнікі культпропу ЦК УсеКП(б) і рэдакцыі газэты «Правда».

Выдача мандатаў—сёньня, 11 красавіка, ад 6 да 9 гадз. веч., у памяшканьні ЦК КП(б)Б (вул. К. Маркса, дом 13) і заўтра, 12-га красавіка, ад 11 да 2 гадз. дня (зварачацца да членаў арг. камісіі т. т. Вержбаловіча і Маёрава).

Да ўсебеларускай нарады рэдактароў фабзаводзкіх друкаваных газэт

Паводле пастановы арганізацыйнай камісіі па скліканьні першай усебеларускай нарады рэдактароў фабзаводзкіх друкаваных газэт, у далатак да ўжо надрукаванага сьпісу, для ўдзелу ў нарадзе выклікаюцца **старшыні рэдкалегій насьценгазэт** т. Менску наступных прадпрыемстваў:

Абутковая фабрыка, гута «Пралетары», завод «Дрэваапрацоўшчык», шчацінная фабрыка, вагонный майстэрні МБВ чыгункі, шкотачная фабрыка, завод «Чырвоная Зорка», фабрыка «Адраджэньне», фабрыка «Чырвоны Тэкстыльшчык», галянтарэйная фабрыка, пабудовы ўнівэрсытэцкага гарадка, пабудовы дому ўраду.

На мандаты зварачацца ў Культпроп ЦК КП(б)Б 12-IV ад 11 да 12 гадзіны і ад 5 да 6 гадз. веч. да т. **Рогавай.**

АРГКАМІСІЯ.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА

У суботу, 12 красавіка, а 7 гадз. увеч.

АДБУДЗЕЦЦА

агульны сход Менскай філіі БелАПП.

Парадак дня: 1. Справаздача бюро філіі. 2. Перавыбары бюро філіі. 3. Бягучыя справы.

Прысутнасьць для ўсіх членаў філіі абавязкова.

Увага: Роўна а 6 гадз. адбудзецца пасяджэньне кам. фракцыі філіі.

Бюро філіі.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску
Б. Лаўрэнеў.
Пятніца, 11 красавіка для саюзу камунальнікаў
РАЗЛОМ
п'еса ў 4-х дзеях.
Рэшта білетаў у касе тэатру і ў рабочай касе. **Пачатак а 8 гадз.**

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Мастацкі фільм вытворчасьці Белдзяржкіно
ГАТЭЛЬ САВОЙ у 6 част.
Звыш праграмы культ-фільм у 3 частках. **Зямля кліча**
Пачатак а 7 г. Каса ад 5 гадз.
На дзенных кіно-сэансах дэманструецца:
1. Культ-фільм у 6 частках **НАФТА**
2. Весёлая навэла у 7 ч. **Літучае шчасьце.**
Дзённыя сэансы: 1 гадз., 3 гадз. 20 м.

КІНО ПАЛАЦ
Нямецкі фільм **Марцін Фалькхаген**
У галоўнай ролі **Жэні Портэн**
Звыш праграмы: **кіно-хроніка «Совкино»**
ПАЧАТАК СЭАНСАЎ:
Дзённым: 1 гадз. 50 м., 3 гадз.
На дзённыя сэансы ўсе білеты па 25 кап.
Каса ад 12 гадз. дня.
Вечэрнім: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса ад 5 гадз.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
З прычыны выключнага посьпеху **2-гі тыдзень** мастацкі фільм
ЮДА
меладрама ў 6 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.
Каса адкрыта ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр ЮНЫ ПІЯНЭР
Мастацкі фільм па аповесьці Д. ФУРМАНАВА
МЯЦЕЖ
у 6 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз., 2-га-3 г. 30 м.
Каса адкрыта ад 12 гадз.

КІНО СПАРТАК
Звыш праграмы выступленьне **РАЗАНСКІХ БАБ Фёдаравай і Русінскай.**
У рэпэртуары частушкі—лубок
На экране вытворны фільм **БАБЫ РАЗАНСКІЯ**
драма ў 6 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 г. 30 м.

СКОРА
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ
па аповесьці
Ус. ІВАНОВА

ДОМ АСЬВЕТЫ
Сёньня 11-га красавіка для членаў саюзу працасьветы Белдзяржтэатрам пад кір. ГАЛУБКА будзе пастаўлена п'еса
„ДЫКТАТУРА" у 4-х дзеях 11-ці абразох.
Білеты у касе. Дому з 12—2 і з 6—10 г. Пачатак а 8½ г. увеч.

Да ведама ўсіх, хто цікавіцца гаспадаркай, культурай, народанасяленьнем БССР.

Паступіла ў продаж кніжка да 10-годзьдзя існаваньня БССР
„БССР У ЛІЧБАХ"
— каштуе са скідкаю 1 руб.

Кніжка мае аддзелы: а) палітычны, б) тэрыторыя, насельніцтва, харчаваньне і жыльлёвы фонд, в) прамысловасьць і сельская гаспадарка, г) асьвета, культура, д) таваразгарот-гаапэрацыі, е) транспарт і сувязь да інш.

Кожны партыец, камсамолец, грамадзкі працаўнік, настаўнік, аграном, каморнік, навукова-даследчыя установы, савецкія, каапэрацыйныя прафэсыянальныя, грамадзкія арганізацыі зкіруюць патрэбны ім матар'ял у гэтай кніжцы.

Кніжку можна выпісаць і набыць у **эканоміка-статыстычным сэктары Дзяржплану**—Менск, Камуністычная № 16.

Прысылка за кошт заказчыка.

ЗЬБІРАЙЦЕ ЛЕКАВЫЯ ТРАВЫ!

Вучні школ і піянэр-атрады! Арганізуйце брыгады па зборы лекавых траў. Не давайце гінуць у палёх сотням тысяч рублёў!

Збор лекавых траў—
ДОБРЫ ЗАРАБОТАК
для дзяцей беднаты.

Белмэдгандаль у бягучым годзе, як і ў мінулыя гады, ПРАЗ УСЕ АПТЭКІ ў раёнах і ў гарадох Беларусі купляе высушаныя лекавыя расьліны: валер'яну, белену, талакнянку, пялынь (ліст), ліпавы цвет, чарніцы, лікаподзі (дзеразa), маліну сушаную, ядлавец (ягады), спарыньню (чорныя ражкі жыта), дубровку—корань, крапіўны ліст, кару крушыны, кмін, смарчкі, хвашвыя пупышкі, рабіны (ягады), алуванчык (корань), мурашкавыя яйкі, канюшыну чырвоную, верны корань

АЧЫШЧАНЫ.

Па ўсіх пытаньнях зварачацца ў бліжэйшую аптэку.

Белмэдгандаль, Менск, Пляц Волі, 29.

Згубленыя і ўкрадзеныя наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Мэтрыч. вып. Новікавай А. С., выд. 1 брыгар. с.-с. Мен. акр. за № 123. 515
Каап. кн. № 585 Новака Я. В., выд. Калодзішч. спаж. т-вам 516
Мэтрыч. вып. Драздоўскага Э. О., выд. Ленінгр. ЗАГС'ам. 517
Пропуск на ст. Негарэлае МБВ чыг. Трахтэнбэрг І. А., выд. АДТ ДПУ ст. Менск 518
Вайск. біл. Фрыдлянда М. І., выд. Барысаўск. ваенкаматам 519
Чл. біл. саюзу дрэваапрац. Целяшэўскай А. Г. 520
Вайск. кн. Палянчука Д. Д., выд. б. Дуліцк. ВВК. 521
Пашпарт Максімавай Е. І., выд. Корсікаўск. міліцыяй. 522
Парт. біл. № 081576 Лашкевіча М. П., выд. Мен. АК КП(б)Б 523
Чл. б. саюзу нархарч Мехеда А. Б. 524
Бірж. талён Барушанскага М. Т., выд. Мен. біржай працы 525
Вайск. біл. Левіча А. А., выд. 39 кав. палком. 526
Парт. біл. Самковіча Т. М., выд. Барысаўск. РК КП(б)Б. 527
Пасьведч. № 12 Дзейка А. П., выд. Мен. Гідракультэхн. 528
Каап. кн. Труса І. І., выд. ТПО ст. Менск МБВ ч. 529
Мэтрыч. вып. Брудцера Г. І., выд. Мен. ЗАГС'ам. 530
Пашпарт Вышмунскай Л. М., выд. Чэрмахоўск. міліцыяй. 531

УКРАДЗЕНЫ дакументы на імя ПАШКЕЕВА Я. Д.:

Парт. біл. № 0813169, выд. Кал